Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СТУДЗЕНЬ 22 1933 г.

№ 18 (4562)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ ВЫНІКАХ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК УсеКП(б) — даклад тав. Кагановіча (1, 2 і 3 стар.).

Ул. І. ЛЕНІН—КЛАРЫ ЦЭТКІН 3 стар.).

Успаміны тав. Крупскай аб Леніне (3 стар.).

Аб направільным якасным уліку загатоўленага ільнавалакна ў раённых канторах Загатільну і няправільным інфармаваньні ЦК Загатільном аб колькасьці загатоўленага ільну—пастанова ЦК КП(б)Б (4 стар.).

ПРА НАЗНАЧЭНЬНЕ АСОБНАУПАУНАВАЖАНЫХ ЦК КП(б)Б і СНК ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ—пастанова Савету народных камісараў і ЦК КП(б)Б. (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Японскія камэнтарыі да паведамленьня ТАС (4 стар.).

Ваенныя апэрацыі на граніцах Жэхэ (4 стар.).

# Аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

## Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на аб'яднаным пленуме Маскоўскага абласнога і гарадзкога камітэтаў УсеКП(б) супольна з сакратарамі РК і актывам Маскоўскай арганізацыі 17 студзеня 1933 г.

Таварышы, можна без перабольшэньня сказаць, што аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК зьяўляецца сапраўды гістарычным пленумам. Гэты пленум адбываўся на рубяжы першай і другой пяцігодак. Ён падагуліў вынікі вялізарнага будаўніцтва першай пяцігодкі, даў аналіз палітычнага зьместу гэтых вынікаў, наметіў шляхі заўтрашняга дня, паставіў карэнныя задачы перад нашай партыяй на цэлую доўгую паласу разьвіцьця.

Пленум абмеркаваў чатыры пытаньні. Усе гэтыя пытаньні цесна зьвязаны паміж сабой. Першае — вынікі пяцігодкі. Другое — аб палітычных аддзелах МТС, або па сут насьці справы, аб чарговых задачах партыі ў вёсцы. Трэцяе — унутрыпартыйнае становішча аб антыпартыйнай групоўцы Сьмірнова, Эйсмонта і Талмачова і, нарэшце, чацьвертае — аб чыстцы партыі.

### 1. Аб значэньні першай пяцігодкі

Каб зразумець усё значэньне першай пяцігодкі, кожнаму партыйцу, рабочаму і калгасьніку неабходна ўспомніць: чым была дакастрычніцкая Расія?

Яна была тэхнічна і культурна адсталай краінай. Мала сказаць адсталай, у радзе раёнаў — да дзікасьці адсталай. Эканоміка дакастрычніцкай Расіі знаходзілася на сярэдневяковым узроўні. Заводы і фабрыкі належалі капіталістам, зямля — памешчыкам і кулакам. Працоўныя масы перажывалі падвойны ўціск: фэадальна-дваранскі і капіталістычны. Вялікая колькасьць заводаў належала замежным капіталістам. Па істоце справы, дакастрычніцкая Расія была напаўкалёніяй замежных капіталістаў.

У вёсцы мы мелі панаваньне памешчыкаў і кулакоў. Выміраў цэлы рад вёсак. Мільёны высковай беднаты вандравалі з поўнчы на поўдзень, з вёскі ў горад, шукаючы работы. Усюды — зьбядненьне, наўнарызм.

Лютаўская рэвалюцыя істотнай зьмены ня ўнесла. У лютаўскія дні і ад лютага да кастрычніка нічога не зьмянілася ў эканоміцы краіны. Стараліся замацаваць старыя адносіны: сяляне расстрэльвалі за спробы ўзяць зямлю ў памешчыкаў.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ўнесла карэнную зьмену. Памешчыкі і капіталісты былі экспрапрыяваны. Палітычная ўлада была захвачана пралетарыятам. Дыктатура пралетарыяту заключаецца ня толькі ў тым, каб уладу завяваць — трэба ўтрымаць гэту ўладу ў руках пралетарыяту. Абараніць яе ў агні грамадзянскай вайны. І далей — перабудаваць краіну карэнным чынам, перабудаваць на сацыялістычных пачатках, разьвіць усе прадукцыйныя сілы краіны, выкарыстаць для гэтага ўсе магчымасьці. Але грамадзянская вайна не дала магчымасьці дыктатуры пролетарыяту разгарнуць усю сваю магутнасьць у справе гаспадарчага будаўніцтва.

Зруйнаваная імпэрыялістычнай вайной гаспадарка ўсё падала. Краіна, рабочая кляса, сялянства былі ахоплены пафасам грамадзянскай вайны. Мы павінны былі абараніць уладу, ня было калі думаць пра гаспадарку. Памятаеце карціну 1919-20 і нават 1921 г. Фабрыкі і заводы стаялі. Здабыча вугалю ўпала. Рабочыя разыходзіліся на вёсках, шукаючы кавалка хлеба. На заводах вырабляліся зажыгалкі. Нашы ворагі даказвалі, што бальшавікі могуць толькі руйнаваць, а на творчую справу яны ня здольны.

Краіна была ў кольцы блёкады. Цяжка было жыць у гэтых умовах. Скабжэньне рабочых дайшло да аднэй чвэрткі жытняга хлеба. І тады ў Маскве на сходах гаварылі рабочым: «пачакайце, будзе ня чвэртка, а дабёмся і будзе фунт хлеба». У адказ на эта рабочыя, заражаючыся энтузіязмам, пі эсам барацьбы, ішлі ў бой, хоць і ня мелі фунта хлеба.

Грамадзянская вайна скончылася перамогай. Пачаўся працэс адпаўленьня народнай гаспадаркі. Мы ўвялі НЭП. Пры ўвядзеньні НЭП'у і потым пры разьвіцьці яго многія не зразумелі яго сутнасьці.

Але партыя правільна зразумела НЭП. Яна зразумела яго па-ленінску.

Яшчэ на XIV зьезьдзе партыі ў 1925 г. тав. **Сталін** гаварыў:

«НЭП ёсьць асобная палітыка пралетарскай дзяржавы, разьлічаная на дапушчэньне капіталізму пры наяўнасьці командных вышынь у руках пралетарскай дзяржавы, разьлічаная на барацьбу элемэнтаў капіталістычных і сацыялістычных, разьлічаная на ўзрастаньне роли сацыялістычных элемэнтаў ва ўпраўленьні элемэнтам капіталістычным, разьлічаная на перамогу сацыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі элемэнтамі, разьлічаная на зьнішчэньне клясаў, на набудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі».

У часе НЭП'у пралетарская дыктатура сабрала рабочых, кансалідавала рабочую клясу на фабрыках і заводах, аднавіла сельскую гаспадарку, ажывіла гандаль, хоць гандаль з дапушчэньнем капіталістычных элемэнтаў.

Аднак, краіна заставалася на нізкім тэхніка-эканамічным узроўні.

Партыя дабівалася ня толькі ленінскага разуменьня, але і ленінскага ажыцьцяўленьня НЭП'у. Партыя разумела словы Леніна аб тым, што «шакуль мы жывем у дробна-сялянскай краіне, для капіталізму ў Расіі ёсьць больш моцная база, чым для камунізму». А таму яна практычна дабівалася таго, каб у краіне нашай перастала пераважаць дробна-сялянская гаспадарка, ператварыўшы краіну з аграрнай у індустрыяльную.

Нам трэба было ў паскораным парадку ліквідаваць тэхнічную і эканамічную адсталасьць, якая ставіла нас у залежнае становішча ад капіталістычных краін.

І вось партыя, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна, паставіла пытаньне аб вызваленьні нас ад гэтай залежнасьці, аб стварэньні моцнай базы нашай незалежнасьці.

Базавацца доўга на дзьвёх процілеглых асновах, як гэта яркa паказаў у сваім дакладзе тав. Сталін, нельга. З аднаго боку, сацыялістычная прамысловасьць і пралетарыят, а з другога боку, тэхнічна і эканамічна адсталая вёска: саха, драўляныя бораны, плугі. Першае — зьнішчыла капіталізм, другое — спараджала капіталістычныя элемэнты. Трэба было па магчымасьці хутчэй зжыць, перамагчы гэту супярэчнасьць нашага грамадзтва пераходнага перыяду.

Разьбіўны ўшчэнт антыпралетарскія, як гэта потым паказаў вопыт, контр-рэвалюцыйныя трацкісцкія і праваўхіліцкія тэорыі, перыя паставіла перад сабой задачу зьмяніць і перабудаваць краіну, перабудаваць нашы заводы, пабудаваць новыя, аснашчоныя сучаснай перадавой тэхнікай, рэкан струяваць на сацыялістычнай аснове сельскую гаспадарку, мэханізаваць сельска-гаспадарчую працу.

Як гэта зрабіць? Плян гэтага і быў дан у пяцігодцы. Перад пяцігодкай і была паставлена задача: перавесьці краіну з рэек адсталай тэхнікі на рэйкі сучаснай тэхнікі: ператварыць нашу краіну з аграрнай у краіну індустрыяльную, самастойную, незалежную; выцясьніць да канца капіталістычныя элемэнты, падвесьці эканамічную базу пад палітыку ліквідацыі кулацтва як клясы, пад палітыку зьнішчэньня клясаў; стварыць індустрыю як базу для рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі; калектывізаваць сельскую гаспадарку, зьнішчыўшы такім чынам небясьпеку аднаўленьня капіталізму ў нашай краіне; узьняць на належную вышыню абароназдольнасьць нашай краіны, узброіць нашу рэвалюцыю супроць інтэрвэнцыі. Такая задача пяцігодкі.

### II. Вынікі першай пяцігодкі

Якія-ж вынікі? Чаго мы з вамі дабіліся? Ці рэальны быў плян? Тав. Сталін у сваім дакладзе ярка паказаў, якія існавалі пункты гледжаньня ў міжнародных капіталістаў на нашу пяцігодку (мы павінны вывучаць тое, што пра нас гавораць ворагі). Адны гаварылі: перамогуць, другія енчылі: не перамогуць. Ясна, што ўсе чакалі з нецярплівасьцю канца пяцігодкі. Чакалі з нецярплівасьцю канца пяцігодкі рабочыя і сяляне. Што-ж рэальна атрымалася?

На гэта пытаньне пленум ЦК даў ясны пядвузначны адказ: так, мы перамаглі — гэта зусім бясспрэчна — і колькасна і якасна. Пяцігодка за чатыры гады выканана па прамысловасьці на 93.7 проц. Не хапае 6 проц. Тав. Сталін растлумачваў у сваім дакладзе, у чым сутнасьць справы. Калі ў нас узмацнілася ваенная небясьпека, нашы вытворчыя пляны былі зьменены, перабудаваны. І гэта дало магчымасьць узмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

Ва ўсякім выпадку нам шкадаваць няма чаго, што мы гэтых 6% недавыканалі. Мы, зразумела, вельмі рады, што нам ня прышлося пусьціць у ход зараз тыя прадукты прамысловасьці, якія мы падрыхтавалі, але затое мы гатовы да гэтага і ў выпадку, калі гэта запатрабуецца, мы гатовы адбіць атакі і напад ворагаў. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

Я ня буду тут паўтараць усёй сумы фактаў, лічбаў, ілюстрацый, якія ўжо апублікаваны і якія, я спадзяюся, кожны з вас прачытаў. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ў галіне прамысловасьці мы гіганцкі найшлі наперад. У нас вырасьлі новыя гіганты чорнай і каляровай мэталюргіі, хэміі, энэргетыкі, машынабудаўніцтва, трактарабудаўніцтва, складанага сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, выраб аўтамабіляў, магутных паравозаў і вагонаў, буйных турбін, генэратараў, абсталяваньня для апалавай прамысловасьці і электрастанцый, самалётабудаўніцтва, матарабудаўніцтва, складанае вэрштатабудаўніцтва і г. д. і г. д.

Мы пабудавалі зусім новую вугольна-мэталюргічную базу на Ўсходзе. ЦК партыі з дня ў дзень кіраваў усім ходам барацьбы за пяцігодку. У ходзе яе ажыцьцяўленьня былі зьмешаны ўсе яе першапачатковыя варыянты — тыя праекты якія былі аптымальнымі, потым аказаліся мінімальнымі.

Удзельная вага індустрыі ў народнай гаспадарцы ўзрасла з 48 проц. у 1928 г. да 70 проц. у 1932 г., прычым цяжкае машынабудаўніцтва па ўдзельнай вазе ўнутры самой прамысловасьці ўзрасло за гэты час з 44,5 проц. да 53 проц. Аб'ём узрос з 13,6 млрд. у 1928 г. да 34,3 млрд. руб. у 1932 годзе, г. зн., больш чым у два разы павялічыўся аб'ём прадукцыі нашай прамысловасьці, а ў параўнаньні з даваеннай — больш чым у тры разы.

Што датычыць цяжкай індустрыі, то цяжкая індустрыя за чатыры гады дасьць ням рост у 3,3 раза: калі цяжкая індустрыя давала ў 1928 г. прадукцыі на 4 млрд., то зараз яна дае прадукцыі на 13,2 млрд. Пяцігадовы плян па цяжкай прамысловасьці выканан на 108 проц. Тут відаць, як у люстры, у лічбах палітыка Х. Г. Арджанікідзе; усе прамысловасьці вырасла больш чым у два разы, цяжкая індустрыя вырасла ў 3,3 разы.

Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць за чатыры гады пяцігодкі склалі 23,3 млрд. руб., а па пяцігадовым пляне было намечана 18,8 млрд. руб., значыцца, і тут мы маем перавыкананьне (124 проц. пляну).

Па транспарту, ня гледзячы на рад затрудненьняў, мы маем вялізарныя дасягненьні: павысілася тэхнічная ўзброенасьць транспарту, вырас грузазварот з 156,5 млн. тон у 1928 г. да 265 млн. тон у 1932 г., на высілася сутачная падача вагонаў.

Адно, у чым мы адстаем, — гэта ў справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы. За час пяцігодкі прадукцыйнасьць працы павялічылася на 38 проц., што ніжэй пляновых намечаньняў пяцігодкі. І сапраўды, пры такім росьце тэхнічнага ўзбраеньня рабочага, прадукцыйнасьць працы бясумоўна можна-б узьняць многа вышэй. Даволі ўказаць, што электраўзброенасьць рабочага за час пяцігодкі ўзьнялася на 41 проц.

Некалькі прыкладаў, якія характарызуюць вынікі першай пяцігодкі на Маскоўскай вобласьці.

Па г. Маскве мы маем за пяцігодку павялічэньне прамысловасьці ў 2½ разы, а сучпроць даваеннай — у 4 разы. Да пачатку першай пяцігодкі Маскоўская вобласьць выпускала прамысловай прадукцыі на 3.160 млн. руб., у канцы пяцігодкі — на 6.529 млн. руб. Аб'ём прамысловай прадукцыі ў параўнаньні з 1928 годам вырас па ўсёй вобласьці больш чым у два разы (206,9 %). Цяжкая прамысловасьць па вобласьці павялічыла сваю прадукцыю з 775 млн. руб. да 2.920 млн. руб., г. зн. у 3,8 раза (376,6 проц.). Прашу зьвярнуць увагу на гэту лічбу: уся прамысловасьць па вобласьці павялічылася нашмога больш, чым у два разы, тады як цяжкая прамысловасьць па Маскве і вобласьці вырасла амаль у чатыры разы. Чым гэта тлумачыцца? Гэта тлумачыцца тым, што Масква і вобласьць разьвівалі цяжкую прамысловасьць: машынабудаўніцтва, электратэхніку, барштатабудаўніцтва і мэталюргію. Усе вы памятаеце, якую дэматогію разьвівалі правыя ўхілісты і, у прыватнасьці, праваапартуністычныя элемэнты, што сядзелі адзін час у маскоўскім кіраўніцтве. Падводзячы вынікі пяцігодкі, мы тут, у Маскве, маем свае спэцыфічныя ўскаміны. У пачатку пяцігодкі Маскоўская арганізацыя была паставлена перад вельмі цяжкім выпрабаваньнем, адзін час кіраўніцтва Маскоўскай арганізацыі аказалася праваўхіліцкім. Іменна яно — гэта кіраўніцтва — спэкулявала быццам на разьвіцьці лёгкай індустрыі, яно выступала супроць разьвіцьця цяжкай індустрыі, машынабудаўніцтва, мэталюргіі і тым яно падсякала і лёгкую індустрыю.

Над непасрэдным кіраўніцтвам тав. Сталіна Маскоўская арганізацыя, вытрымаўшы выпрабаваньне, выкрыла гэта правааппартуністычнае кіраўніцтва і ізалявала яго. Маскоўская арганізацыя ў барацьбе з правымі ўхілістамі выйшла пераможцам. Яна стала ў першыя рады байцоў за генэральную лінію партыі, стала моцным апорай ленінскага ЦК на чале з тав. **Сталіным.** Арганізацыя па-бальшавіцку вытрымала экзамэн на працягу ўсёй пяцігодкі і паказала ўзоры барацьбы за выкананьне генэральнай лініі партыі. **(Аплёдысмэнты).**

Ці расла ў нас лёгкая індустрыя? Так, расла. Правыя ўхілісты процістаўлялі лёгкую індустрыю — цяжкай. Партыя не процістаўляла гэтыя галіны прамысловасьці, яна адначасова разьвіла, робячы націск на цяжкую індустрыю, абедзьве гэтыя галіны. Вось факты: прадукцыя лёгкай прамысловасьці (Наркамлёгпраму) па вобласьці з 2.178 млн. руб. у 1927-28 г. г. узрасла да 3.102 млн. руб. у 1932 г. Рост на 42,4 проц., г. зн. амаль у 1½ разы.

Баваўняна-папяровая прамысловасьць мае невялікі рост. Было прадукцыі на 1.260 млн. руб., цяпер — на 1.325 млн. руб. Затое трыкатажная прамысловасьць значна ўзрасла, павялічыўшыся на 211,5%, гарбарна-абутковая прамысловасьць павялічылася амаль у два разы, прычым абутковая прамысловасьць, якая давала прадукцыі на 65 млн. руб. у першым годзе пяцігодкі, цяпер дае ва 135 млн. руб. прадукцыі. Харчовая прамысловасьць (НКСнабу) у вобласьці ўзрасла за гэты час з 207 млн. руб. да 517 млн. руб., г. зн. на 250,1 проц., або ў 2½ разы. Гэтыя факты абвяргаюць усе сьцьвярджэньні апартуністаў аб тым, што партыя «забыла», што яна «ігнаруе» разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці, і ў тойжа час гэтыя факты паказваюць, што пераважаючай, афарбоўваючай у пэўны колер усё разьвіцьцё прамысловасьці Маскоўскай вобласьці зьяўляецца, зразумела, цяжкая індустрыя, якая дае больш высокія тэмпы росту.

Якія-ж тэмпы па розных галінах? Возьмем каменны вугаль. Масква мае падмаскоўны вугаль, але да пяцігодкі на гэты вугольны басэйн сур'ёзнай увагі не зварачалі. У пачатку пяцігодкі ён даваў 1.178 тыс. тон у год. У 1932 г. ён дае ўжо 2.850 тыс. тон у год. Рост амаль у 2½ разы. Гэта мала. Гэта, бясумоўна, мала. Падмаскоўны басэйн адстаў і ён павінен будзе ў другой пяцігодцы вельмі падцягнуцца. Па торфе павялічэньне ў 2 разы. Таксама яшчэ мала.

Мэталічная прамысловасьць павялічыла сваю прадукцыю ў 4 разы: у 1928 г. яна давала прадукцыі на 377 млн. руб., у 1932 годзе 1.582 млн. руб., рост 419 проц.

У тым ліку чорная мэталюргія давала 33 млн. руб., а цяпер 131 млн. руб., павялічэньне 398,7 проц.

Аўтабудаўніцтва — 19 млн. руб., цяпер 229 млн., павялічэньне ў 12 раз. Сельгасмашынабудаўніцтва — рост 227,3 проц. Чыгуначнае машынабудаўніцтва — павялічэньне ў 2,5 раза. Зварачаю асаблівую вашу ўвагу на вэрштатабудаўніцтва, яно давала прадукцыі ў пачатку пяцігодкі на 7 млн. руб., а зараз дае на 68 млн. руб. Рост амаль у 10 раз.

Электратэхнічная прамысловасьць у 1928 г. давала прадукцыі на 58 млн. руб., а цяпер дае на 435 млн. руб., іменна кажучы, на вялічэньне 751,6 проц. Хэмія — павялічэньне ў 3½ разы. Удзельная вага вырабу сродкаў вытворчасьці ва ўсёй прамысловай прадукцыі вельмі ўзрасла: у 1928 г. яна складала 20 проц., а ў 1932 г. — 45 проц. Узьнялася таму ўдзельная вага вобласьці ва ўсёй прамысловасьці Саюзу.

На ўсіх машынабудаўнічых заводах мы абжывілі вэрштаты на 54 проц. Новых вэрштатаў у прамысловасьці ўстаноўлена 13.285 вэрштатаў. Апрача новых заводаў з новай тэхнікай у нас адбыўся гіганцкі рост новага абсталяваньня на старых заводах.

**Капітальныя ўкладаньні.** Маскоўская вобласьць займае 10 проц. ад усіх капітальных укладаньняў па Саюзу. За чатыры гады было ўкладзена ў маскоўскую прамысловасьць 5 млрд. руб., прычым з гэтых 5 млрд. руб. за адзін 1932 г. укладзена 1 млрд. 700 млн. руб. супроць 659 млн. руб. за першы год першай пяцігодкі, іначэй кажучы, 35 проц. усіх капітальных укладаньняў за пяцігодку ўкладзена ў 1932 г.

Больш паловы (52,7 проц.) усіх капітала ўкладаньняў па Маскоўскай вобласьці найшло па лініі прамысловасьці, а ў межах прамысловасьці — 70-80 проц. капіталаўкладаньняў найшло на цяжкую прамысловасьць.

Выключна цікавы сьпіс новых заводаў, пабудаваных у Маскве. За гады першай пяцігодкі пабудаваны і «рэканструяваны» (па сутнасьці таксама новапабудаваны) наступныя прадпрыемствы. **Па машынабудаўніцтве:** аўтазавод імя Сталіна (б. АМО) на 25 тыс. аўтамабіляў; Дынамо; Аўтазборачны завод КІМ; завод «Шарыкоподшипник» № 1 імя Кагановіча на 24 млн. шарыка-і ролікавых падшыпнікаў; завод рэвальвэрных вэрштатаў на 6 тыс. вэрштатаў у год; «Фрэзэр» на 70 млн. руб. інструментаў у год; «Калібр» — на 75 млн. руб. вымяральнага інструменту і прылад у год; «Станколит»—на 40 тыс. тон ліцьця; вэлёсыпэдны завод — на 150 тыс. машын у год у адну зьмену; Падольскі кранічна-электравозны завод (КЭС), магутнасьцю на 15 тыс. тон: ліцейная на Падольскім мэханічным заводзе, магутнасьцю ў 33 тыс. тон ліцьця ў год, адна з лепшых у СССР па сваёй мэханізацыі; 2 новыя газэнькавыя заводы: 1-ы дзяржаўны газэ завод з магутнасьцю 200 тыс. шт. кішэнных і наручных газэнькаў, 2-гі завод разьлічан на выпуск: 3,5 млн. шт. ходзікаў, 2 млн. шт. будзільнікаў, 52 тыс. электрагадзіньнікаў. **Вялікія рэканструкцыйныя работы** па заводах «Красный Пролетарий», на якім выпуск вэрштатаў павялічыўся з 617 у 1928-29 г. да 2377 вэрштатаў у 1932 г. На Каломенскім пабудаваны новая дызэльная, чыгуналіцейная і мадэльная. На Калінінскім вагонабудаўнічым заводзе будуецца новы пасажыразборачны цэх. На Любярэцкім заводзе сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва пабудаваны новая ліцейная коўшата чыгуну і мэханічны корпус і г. д.

**Па мэталюргіі:** домна № 3 на Касьтэрскім заводзе магутнасьцю ў 120 тыс. тон, роўная 2-м існуючым, завод «Серп і молат» паміма абнаўленьня абсталяваньня, пабудован бэтэмэталічны цэх, скончан каліброўчны цэх і заканчваецца новы фасона-ліцейны цэх, завод «Красная труба» магутнасьцю першай чаргі 10 т. т. жалезных труб, «Электросталь», які павялічыў выпуск да 25 т. т. высокакачасных сталяй, на якім разгорнуты зараз работы па давязеньні ў 1933 г. магутнасьці да 120 тыс. тон. Маскоўскі трубалітэйны завод магутнасьцю 23-24 т. т. чыгунных труб. Нова-Тульскі мэталюргічны камбінат — ня скончана будаўніцтвам. Пуск першай чаргі доменнай печы № 1 — 1 квартал 1933 г. **Па электратэхніцы:** Рэнтгенаўскі завод, які выробляе рэнтгенаўскую апаратуру і радыё, завод «Изолит», які выробляе розныя ізаляцыйныя матар'ялы для электратэхнічных заводаў. Электроны завод выробляе графітныя і вугольныя электроды для патрэб электрамэталюргіі і электрахэміі. **Печаты** будаўніцтвам: завод «Затэм» (дакладнай электрамэханікі) уступіць у эксплёатацыю ў 1933 г., завод «Радиоприбор», пражэктарны завод. **Па хэміі:** тры магутныя хэмічныя камбінаты: Бобрыкаўскі хэмкамбінат—хэмічныя заводы першай чаргі, коштам каля 300 млн. руб. Воскрасенскі фасфата-тукавы камбінат на мясцовых фасфарытах, Угрэскі хэмкамбінат, Яфрэмаўскі завод сынтэтычнага каўчуку — заканчваецца будаўніцтвам. **Па будаўніцтві:** Нова-Падольскі цэмэнтны завод магутнасьцю адзін млн. бочак цэмэнту ў год, Нова-Шчураўскі завод магутнасьцю—1 млн. боч. цэм. ў год, Любярэцкі завод сілікатнай цэглы магутнасьцю 125 млн. штук. Падольскі завод агнятрывалых вырабаў на 80 тыс. тон. Лобненскі завод шамотнай цэглы на 43 тыс. тон Воскрасенскі асбатрубны завод і г. д.

**Па каменным вугалі:** закладзены за 4 гады пяцігодкі 32 новыя капальні па агульную магутнасьць у 9.850 т. т., здана ў эксплёатацыю 18 новых капальняў на агульную магутнасьць 3.160 т. т. Новыя капальні павінны давяць 60,5 проц. усёй здабычы вугалю. **Па лёгкай і харчовай прамысловасьці:** 2 швэйныя фабрыкі — № 3 у Маскве і Калініне, Глухаўская трэбневая фабрыка, завод складаных эфіраў, Мылавараны завод у Маскве, завод скурсурагатаў, мартарышавы завод у Маскве, 20 хлебазаводаў, з іх 6 у Маскве і 14 у вобласьці. У будаўніцтве і часткова пушчаны: Кураўская баваўняна-паяровая фабрыка, Іваншчэйская трэбневая, запалкавая ў Калузе, кінофабрыка ў Ленінскіх гарах, газэтная друкарня, мясакамбінат, гідрагенізацыйны завод і 12 хлебазаводаў.

Новапабудаваны і «рэканструяваны». У нас, напрыклад, такі завод як аўтазавод імя тав. Сталіна б. АМО, лічыцца «рэканструяваным». Калі лічыць гэта рэканструкцыяй, то гэта ўсё роўна, што прышыць палітэ да гузіка **(сьмех).** Пабудован зусім новы завод і гэта завецца «рэканструкцыя». Пры рэканструкцыі некаторых старых заводаў па сутнасьці справы мы пабудавалі зусім новыя заводы. Гэта сьпіс далёка ня поўны, але і тое, што прывесьцена, гаворыць само за слоб.

Палітыка індустрыялізацыі карэнным чынам зьмяніла твар краіны, карта краіны зьмянілася. Гэта зьмена ярка відна на прыкладзе Масквы і вобласьці. Пабудаваны зусім новыя гарады. Створаны новыя прамысловыя центры.

І ў аснове ўсяго — індустрыя.

Калі-б мы будаўніцтва вялі ня такімі шляхам, шляхам падвядзеньня жорсткі ціску

(Працяг на 2 стар.)

стрыяльнай базы, запэўняю вас, мы пабудавалі-б картачны домік, які разваліўся-б пры першым павейваньні маленькага ветрыку. Якраз у тым і справа, што партыя буцавала і пабудавала не маленькі картачны домік на пяску, а сапраўдны моцны савецкі дом на мэталі, змацавала яго цэмэнтам, асвасьціла машынамі, узброіла сродкамі абароны па базе сучаснай тэхнікі. Няхай хтонебудзь з ворагаў паспрабуе гэты савецкі дом перавярнуць. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

Коратка аб дасягненьнях і аб задачах камунальнай гаспадаркі. У камунальнай гаспадарцы — справа проста ідзе аб паляпшэньні матар'яльнага становішча працоўных мас. Пытаньне датычыць жыльля, зачыстк горада, вады, трамваю, каналізацыі. Справа ідзе аб здароўі рабочых. Якія вынікі мы маем тут? У пляне пяцігодкі быў намечан рад задач у галіне гарадзкой гаспадаркі. У гарадзкой гаспадарцы мы прасунуліся значна далей, чым намячала пяцігодка. Па ініцыятыве т. **Сталіна** на пленуме ЦК партыі ў 1931 годзе было спэцыяльна пастаўлена пытаньне аб гарадзкой гаспадарцы. Пасьля гэтага гарадзкая гаспадарка асабліва шпарка прасунулася наперад. Вось некаторыя лічбы, якія характарызуюць размеры гарадзкой гаспадаркі. Жыльлёвы фонд у гарадох і пасёлках краіны павялічыўся за чатыры гады пяцігодкі на 26.700 тыс. кв. мэтр. — амаль у 3½ разы больш, чым за папярэдняе пяцігодзьдзе (1924-28 г. г.). Пасьля ліпеньскага пленуму ЦК да 1932 г. асвоена 3,5 млрд. руб. капітальных укладаньняў у жыльлёвае будаўніцтва, г. зн. у 3½ разы больш, чым у папярэдняе пяцігодзьдзе.

Камунальная гаспадарка краіны за 4 гады пяцігодкі асвоіла 1.820 млн. руб., або ў 3 разы больш, чым за папярэдняе пяцігодзьдзе. Укладаньне ў 1932 г. — у першым годзе пасьля ліпеньскага пленуму ЦК — склала 40 проц. ад укладаньняў за цэлую пяцігодку.

У асаблівасьці гэты рост адносіцца да г. Масквы, камунальнай гаспадаркай якой ЦК тав. Сталін спэцыяльна займаліся. Насельніцтва г. Масквы шпарка павялічваецца. За кошт каго павялічваецца насельніцтва Масквы? Па-першае, павялічэньне насельніцтва гор. Масквы ідзе за кошт масквічоў **(сьмех)** і, па-другое, за кошт вялікага прыезду, прытым часта чужых элемэнтаў. Між іншым мы ўводзім зараз пашпартную сыстэму і ад гэтай катэгорыі насельніцтва Масквы мы не ад таго, каб крыху вызваліцца. За пяцігодку насельніцтва Масквы павялічылася на 50 проц. У 1928 г. было 2.300 тыс., а цяпер 3.600 тыс. Горад вялікі— прыяжджаюць, кватэр у іх няма, перагружаюць горад. Я зварачаю вашу ўвагу на тое, што гэта справа вельмі важная і мае палітычнае значэньне. Пашпартная сыстэма можа вызваліць горад ад нягодных і чужых сводзей.

За прайшоўшыя 4 гады на аднэй Маскве пабудавана жыльлошчы на 2.116 тыс. кв. мэтраў, або на 68 проц. больш., чым пабудаваў Венскі сацыял-дэмакратычны муніцыпалітэт за 13 год (з 1918 на 1930 г.).

Удасканаленыя брукі — гэта вялікае дасягненьне. Думаць, што гэта раскоша, няправільна. Тут захоўваецца здароўе людзей, зьмяншаецца пыл, бруд вялікага гораду. За 4 гады пяцігодкі пракладзена 1,8 млн. кв. мэтраў удасканаленых брукаў, іначэй кажучы, у 7 раз больш, чым за цэлую гісторыю Масквы да 1928 году.

Сярэднясутачная падача вады ў горадзе Маскве павялічылася ў 4 разы ў параўнаньні з даваенным часам. З 8½ млн. вёдраў у 1913 г. і з 16,7 млн. вёдраў у 1928 г. яна ўзрасла ў 1932 г. да 36,7 млн. вёдраў. Для таго, каб забясьпечыць узрасталючыя патрэбы і захаваць ваду Масква-рэкі, будуецца канал Волга-Масква. Сёй-той думае, што гэта раскоша, лішняя штука, але гэта глыбокая памылка, трэба ўмець бачыць заўтрашні дзень, такі горад, як Масква, ня можа жыць пры абмежаваных крыніцах вады.

За пяцігодку ўстаналі 22 тыс. электрычных ліхтароў. Спажываньне электраэнэргіі ў Маскве за пяцігодку ўзрасло ў тры разы, а ў параўнаньні з 1913 годам — у дзевяць раз.

Праўда ў нас размахваюцца часамі проз меру. У вітрынах асабліва многа сьвятла. У вітрыне ў яго шыпі, а гарыць 20 лямпак **(сьмех, аплёдысмэнты).**

У нас яшчэ шмат хібаў і недахопаў, але мы пачалі ўжо ператвараць Маскву ў культурны горад, многія чужаземцы зьдзіўляюцца новаму выгляду Масквы. Вось, напрыклад, як апісвае ў французкай газэце «Матэн» свае ўражаньні аб Маскве французкі сэнатар, былы міністар Віктар Борэ:

«Дзесяціміпутный пасадж ў аўтамабілі па вуліцах гораду даволі, каб пераканацца, што ў жыцьці 1932 г. сталіца СССР мае выгляд вялікарнай будоўлі, над якой узвышаецца спакойны і вокавы Кремль, які цары загадзя адзелі ў чырвоны колер рэвалюцыі.

Усюды ўзвышаюцца амэрыканскага тыпу будынкі, насьпех адзетыя бэтонам; ніжнія паверхі займаюцца ўстановамі яшчэ да скончэньня ўсёй пабудовы. Тут міністэрства там інстытут, тут дамы для рабочых а там вялізарны стадыён, усё ў стылі небаскробаў і казарміў перапавялічанага мадэрнізму, якія прымушаюць мяне больш цаніць старэнькія дамы мяцлача, да якіх я па буржуазнай сле басьці адчуваю чульлівую жаласьць».

Гэты маскоўскі выгляд паўтараецца на ўсёй вялізарнай тэрыторыі Саюзу ад Харкава да Севастопаля, Ялты, Батуму, Тэфлісу, Уладыкаўказу, Растова, Сталінграду, Саратава, Ленінграду, калі гаварыць толькі аб гарадох, лічы я мог адлюдзець...

Усюды ўзстаюць новыя будынкі...

Факты застаюцца фактамі, яны могуць спадабацца або не, але самая лютая ня-

# Працяг даклиду тав. Кагановіча

мылка — гэта добраахвотна ігнараваць іх».

Адначасова ідзе дабрабыт прамысловых галёў воблаcьці і рост новых гарадзкіх цэнтраў (Бобрыкі і г. д.).

На адным з бліжэйшых пленумаў МК, Массавегу разам з актывам нам прыдзецца паставіць пытаньне аб архітэктурным афармленьні Масквы, аб планаваньні Масквы. Мы пачалі гэту справу і мы павінны не скончыць.

Аб мэтрапалітэне. Ужо пройдзена 18 капальняў. Вы ходзіце па вуліцах і не падазраваеце, што ўнізе ўжо ёсьць часткі тавэлю мэтрапалітэну, напрыклад, каля «Надыявалю». Мы будуем мэтрапалітэн з вялікімі труднасьцямі, але, аднак, мы спадзяемся, што мы гэты мэтрапалітэн пабудуем групоўна і што ў 1935 годзе вам пасьля актыву ня прыдзецца стаяць доўга ля трамваю, а вы спусьціцеся проста ў мэтрапалітэн і паедзеце дамоў. **(Сьмех, аплёдысмэнты).**

Усе посьпехі ў галіне камунальнай гаспадкі Масквы ёсьць, паўтараю, сустаўная часьцінка нашай работы па павышэньні матар'яльнага становішча працоўных мас.

У нас ёсьць чым ганарыцца ня толькі ў галіне індустрыі, але і ў галіне матар'яльнага становішча працоўных.

У калішні пяцігодкі людзі прывыклі да факту, што ў нас беспрацоўя няма, што беспрацоўе ліквідавана, і праходзіць як-бы міма гэтага аспэкту зьявішча. А яшчэ ны так даўно мы на заводах атрымлівалі тысячы запісак, асабліва ад жанчын: «што рабіць? Сын у мяне расьце, яму гадоў 15-16, ён хуліганіць на вуліцы, дайце яму работу». Або другое — «я стары кадравы рабочы, ёсьць у сына у мяне, дайце яму работу, дазвольце майму сыну дармова працаваць ля варштата».

Тысячы такіх запісак падавалася. Стары рабочы ў нас ведае, што такое беспрацоўе. Маладыя ня ведаюць. Паглядзеце на беспрацоўных за граніцай. Там прыклады на кожным кроку. Дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, жахі, галеча, голад, а ў працуючага страх перад беспрацоўем. Беспрацоўныя пацісканьць цяжкім грузам на працуючых. Кожны рабочы чакае назаўтра звальненьня. А ў нас? У нас ня толькі беспрацоўя няма, а рабочы выбірае, на якую яму фабрыку, на які яму завод ісьці.

Калі чужаземцы прыяжджаюць да нас і глядзяць якую-небудзь дэманстрацыю, Кастрычніцкую або 1-га мая, яны стаяць, глядзяць і здзіўляюцца. Буржуазныя газэты ім нашумелі, што «рабочыя прыціснуты, нічога няма для яды і вопраткі». А людзі на дэманстрацыі бадзёрыя, весяляцца, пяюць, сьмяюцца і праяўляюць свой энтузіязм сацыялістычнага будаўніцтва. Нягожа, думаюць чужаземцы, бальшавікі такія майстэрскія тэатралы, што яны могуць штучна ўцягнуць мільёны людзей у скокі і песьні, заразіць іх весёласьцю і бадзёрасьцю. Гэтыя чужаземцы многага не разумеюць, яны не разумеюць, што значыць клясa працуючая, клясa, якая стаіць на чале ўлады, клясa адчуваючая, што гэта не работа ёсьць не ўласная, кроўная справа. Такімі могуць быць толькі людзі, завяваўшыя ўладу, страціўшыя страх беспрацоўя. За граніцай рабочы прыціснут капіталізмам, ён ня ведае, што яго чакае заўтра. Можа быць яго заўтра звольняць, яго жонка і дзеці застануцца галодными. А ў нас рабочы мае многае: яго дзіця ў піянэратрадзе, яго жонка працуе, ён можа найсьці ў клюб, вучыцца, адпачываць. У некаторых сем'ях, дзе раней працаваў адзін чалавек, цяпер працуюць два-тры. Кожны рабочы аб'ектыўна адчувае палепшэньне свайго матар'яльнага дабрабыту. Такое значэньне дзіцяці беспрацоўя. Кожны рабочы адчувае, што ён сам удзельнік пралетарскай дыктатуры, ён складаў плян пяцігодкі і выканаў яе з гонарам.

Рабочы ведае, што гэта не якісьці капіталіст зрабіў, ня бог з неба манну нябесную паслаў. Ён сам — пралетар пад кіраўніцтвам партыі ўсё гэта зрабіў і ажыцьцявіў. Перспэктывы і надзеі яго ўзрастаюць з кожным годам.

Або возьмем 7-гадзінны рабочы дзень. Калі партыя ўводзіла 7-гадзінны рабочы дзень, то апазыцыя выступала супроць і гаварыла: ніколі вы гэтага не ажыцьцёвіце, гэта маніўр, выдуманы ЦК. Яны выступалі супроць гэтага гістарычнага акту. Цяпер 7-гадзінны рабочы дзень ужо ўвашоў у жыцьцё, у быт, ёсьць частка самога жыцьця, ёсьць наша заваяваньне.

Лік рабочых у нас узрос за час пяцігодкі ў два разы: народны даход узрос за гэты час на 85 проц. Сярэдняя гадавая зарплата рабочых узрасла: яна складала ў 1928 г. 703 руб., а ў 1932 г. — 1.356 руб. (на пяцігодцы яна павінна была скласьці 994 руб.).

Фонд сацыяльнага страхаваньня ўзрос: у 1928 г. ён складаў 1.050 млн. руб., а зараз — 4.120 млн., г. зн. рост на 292 проц. Няўжо больніцы, медыцынская дапамога, амбуляторыя, дамы адпачынку і г. д. — гэта ня ёсьць палепшэньне матар'яльна-бытавога становішча рабочых мас?

Або возьмеце вёску. У вёсцы раней была вялізарная колькасьць людзей, якія выміралі, жабравалі, пакутвалі, на якіх кулак, заможны чалавек глядзеў з пагардай і эксплёатаваў іх. Сёньня гэтага няма.

Грамадзкае харчаваньне. Людзі прывыклі лічыць, што грамадзкае харчаваньне — гэта пакіталт як само сабой ідзе, самацёкам, бяруць у розьлік толькі паёк, які выдаецца на дом. Яшчэ 3 гады таму назад усе гаварылі аб сталовай на «Электропроводе». Тады толькі-толькі пачыналася разгортваньне грамадзкага харчаваньня. Цяпер такіх сталовых шмат і ёсьць больш добрыя, хоць да гэтага часу са сталовымі ўсё яшчэ ў нас ня ўсё добра: бруд, нясмачна гатуюць, лаюцца.

Грамадзкім харчаваньнем па Саюзу ахоплена 70 проц. рабочых рашаючых галін прамысловасьці. Па Маскве — на грамадзкім харчаваньні ёсьць каля 2 млн. чалавек. Так, у галіне снабжэньня ў нас ёсьць няхваткі, мы ня можам яшчэ забясьпечыць столькі, колькі мы-б жадалі. Партыя школ ня ўтойвала труднасьцяй, наадварот, мы заваставе увагу на іх і мабілізуем актыўнасьць партыі і рабочай клясы для іх зьвядзеньня. У нас не хапае яшчэ даволі тлушчаў, мяса і масла, але ўжо зроблена шмат для палепшэньня рабочага харчаваньня і ўжо тая база, якая створана, прывядзе праз год-два да далейшага сур'ёзнага палепшэньня.

Тут многае залежыць ад нас самых. Калі, напрыклад, партыя ў гэтым годзе пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Сталіна зьвярнула асаблівую ўвагу на шырэйшае ўкараненьне грамадзкага харчаваньня, гэта справа зрушылася і пачала развівацца. Колькасьць тавараў павялічылася, вытворчасьць саматужных вырабаў пашырылася. Вялікая колькасьць тавараў была адпраўлена ў вёску.

Таксама і ў справе разгортваньня савецкага гандлю і снабжэньня вельмі многае залежыць ад нас, ад нашай работы. Напрыклад, з мясам. Калі саўгасы затрымлівалі здачу мяса, мы прымусілі іх даць дакладную справаздачу аб сваёй продукцыі. І на сёньня Масква, Ленінград, Данбас і рад іншых прамысловых цэнтраў забясьпечаны па пэўнай норме поўнасьцю мясам. Грамадзкае харчаваньне таксама мясам забясьпечана поўнасьцю. Па радзе заводаў снабжэньне рабочых перадана заводам, але на некаторых заводах да гэтай пары яшчэ належнай увагі снабжэньню рабочых няма. Перад пар тыйнымі арганізацыямі тут стаіць задача: сваёй практычнай работай забясьпечыць такі парадак, каб тыя прадукты, якія мы маем і якія прызначаны рабочым, рабочы своячасова і акуратна атрымліваў. Пытаньні ўпарадкаваньня выдач і разьвіцьця самазагатовак павінны заўсёды стаяць у цэнтры нашай работы.

Задача вырабу тавараў шырэйшаму, разьвіцьця лёгкай індустрыі стаіць у другую пяцігодку яшчэ больш востра, чым гэта было ў апошнія гады. Выраб прадметаў шырокага спажываньня неабходна ў 1933 г. усямерна фарсаваць, ні ў якім выпадку не аслабляючы тэмпаў. Наогул у 1933 г., у першы год другой пяцігодкі, мы павінны паказаць, што мы ня толькі першую пяцігодку за 4 гады выканалі, але што мы і ў першы год другой пяцігодкі ня будзем аслабляць напружаньня, энэргіі і волі ў нашай рабоце. Канкрэтная праграма розных галін народнай гаспадаркі 1933 г. дана ў пастановах пленуму і ў дакладах т. т. **Молатава і Куйбышава.** Пленум МК партыі павінен будзе спэцыяльна абмеркаваць пытаньне аб кантрольных лічбах па 1933 г. для Масквы і Маскоўскай вобласьці на адным з бліжэйшых сваіх пасяджэньняў, асабліва завастрыўшы ўвагу на задачы **асваеньня** прамысловасьці. Па гэтым-жа пленуме прыдзецца абмеркаваць пытаньні снабжэньня, пачынаючы з ЗРК, з аддзелу рабочага снабжэньня, крамы і канчаючы работай МСПО і Абленкабу. Ад пачатку да канца трэба паглядзець усю нашу работу ў гэтай галіне і прыняць меры да выкараненьня недахопаў. Супакойвацца на дасягненьнях нельга.

Мы павінны, асабліва Масква, усямерна разьвіваць выраб тавараў шырэйшаму. У Маскве мы сутыкаліся ня толькі з перашкодай лёгкай індустрыі, але таксама і з наплывацельскімі адносінамі да лёгкай прамысловасьці. Мы пабудавалі Касагорскую домну, Тульскі завод, завод Электрасталь, пабудавалі рад навейшых машынабудаўнічых заводаў і г. д. Аднак, было-б не па-бальшавіцку і няправільна ігнараваць інтарэсы лёгкай індустрыі, выраб прадметаў шырэйшаму. У Маскве ёсьць шмат прадпрыемстваў лёгкай індустрыі. Увагі тэкстыльнай прамысловасьці і яе перабудаваньню, харчовай і гарбарна-абутковай прамысловасьці з боку Маскоўскага камітэту аддана шмат.

Хартовая прамысловасьць рабочых цэнтраў з году ў год узмацняе сваю сыр'ёвую базу (прыгарадныя гаспадаркі, гародніна і г. д.).

* * *

Таварышы, калі ў першай пяцігодцы мы больш за ўсё націскалі на новае будаўніцтва, маючы вялікую ўдзельную вагу старых прадпрыемстваў, на базе якіх лёгка было паскорванымі тэмпамі разьвіваць прамысловую вытворчасьць, то нашы задачы зараз заключаюцца ў тым, каб сканцэнтравацца **побач** з далейшым разьвіцьцём нашага будаўніцтва, **побач** з далейшым будаўніцтвам новых заводаў на асваеньні новых прадпрыемстваў у прамысловасьці.

Тав. **Сталін** падкрэсьліў, што ў першай пяцігодцы ўсе мы былі ахоплены пафасам новага будаўніцтва, пафасам новых будоўляў таксама, як мы ў грамадзянскую вайну былі ахоплены пафасам грамадзянскай вайны. Цяпер мы ранейшы пафас новага будаўніцтва павінны даповніць пафасам асваеньня і пафасам якасьці прадукцыі, пафасам асваеньня нашых заводаў, умацаваньня нашых прадпрыемстваў і ў горадзе і на вёсцы.

У першую пяцігодку мы мелі неабходнасьць і магчымасьць разьвівацца больш паскоранымі тэмпамі. Цяпер мы бярэм менш паскораныя тэмпы прыросту прамысловай прадукцыі.

У прамове тав. **Сталіна** вы чыталі ілюстрацыю, якую ён даў адносна таго, што ўласна ўяўляюць з сябе процанты росту, якую матар'яльную велічыню ўяўляе кожны процант. Калі, напрыклад, на старым заводзе АМО ў 1925-26 годзе адзін процант прыросту прадукцыі складаў адзін аўтамабіль, то зараз на заводзе АМО адзін процант росту прадукцыі складае ўжо 28 аўтамабіляў. Гэта розьніца ясная кожнаму.

Нашы задачы зараз заключаюцца ў тым, каб мы з вамі побач з новым будаўніцтвам наляглі на асваеньне нашых заводаў, на асваеньне абсталяваньня, на тое, каб патаніць сабекошт будоўляў. Трэба налегчы на якасьныя паказальнікі, узьняць прадукцыйнасьць працы і палепшыць работу мэханізмаў. Зразумела, і ў будаўніцтве трэба налегчы на якасныя паказальнікі. Хваліцца нельга тым, што выдатковаў 100 млн. Наш гаспадарнік, які будуе каналізацыю, можа сказаць: я выдатковаў столькі і столькі мільёнаў, а пам гэтага мала, мы запытаем, колькі ты кілёмэтраў каналізацыйных труб праклаў? Ці сапраўды ты пры дапамозе грошай праклаў трубы або ты проста грошы ў трубу пусьціў. **(Сьмех).**

У нас вялікая колькасьць недахопаў на заводах. Мы пабудавалі шмат заводаў, паставілі тысячы новых варштатаў, але мы яшчэ павінны гэтыя заводы і варштаты як належыць **асвоіць.** Гэта адносіцца да Маскоўскай вобласьці асабліва, бо ў ёй праведзена гігантская будаўніцтва новых заводаў і паставлена шмат новых варштатаў.

Асваеньне не выключае, а мае на мэце далейшае разьвіцьцё новага будаўніцтва. Мы і ў 1933 г. укладваем у прамысловасьць па адзін мільярд рублёў больш, чым у 1932 годзе. (10.109 млн. руб. у 1933 г. супроць 9.164 млн. руб. у 1932 г.).

Мы правозім далей разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце ў новых умовах, з новымі сіламі.

## III. Сельская гаспадарка і задачы партыі ў вёсцы

Некаторыя былыя правыя ўхілісты прабуюць маляваць справу так, што яны былі за індустрыялізацыю краіны і што адзіная іх памылка заключалася ў тым, што яны моў, не прадугледзелі працэсу калектывізацыі вёскі. Але ўсе ведаюць, што такі пакал пазыцыі правых зьяўляецца няправільным— яны былі супроць палітыкі індустрыялізацыі, якая настойліва праводзілася партыяй, яны былі тым самым супроць сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Сёньня мы можам сказаць проста, што посьпехаў у сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, у калектывізацыі асноўных мас працоўных сялян мы дабіліся, галоўным чынам, таму, што мы здолелі падвесьці пад сельскую гаспадарку краіны сур'ёзную індустрыяльную базу.

Толькі на базе індустрыі пралетарская дэяржава магла аказаць буйнейшую эканамічную і палітычную дапамогу сельскай гаспадаркі воблаcьці. Параўнаньне першай паловы (1929—1930 г.г.) з другой паловай пяцігодкі (1931 і 1932 г. г.) дае вялікі рост у загатоўках: **па збожжы**—з 41 млн. да 65 млн. пуд., **па ільнавалакне**—з 3 млн. пуд. да 5 млн. пуд., **па бульбе**—з 64 млн. пуд. да 136 млн. пуд., **па гародніне**—з 21 млн. да 68 млн. пуд. Ня гледзячы на бязупынны рост адыходніцтва ў гарады (з 165 тыс. у 1917 г. да 800 тыс. у 1932 г.), Маскоўская воблаcьць замест спажывецкага характару гаспадаркі ў дарэвалюцыйны час увесь час прасоўвалася наперад, ператвараючыся са спажывецкай у вытворчую.

СССР з краіны дробнасялянскай ператвараўся ў краіну самага буйнага зямляробства.

Новае на вёсцы заключаецца ў тым, што на аснове калектывізацыі мы разграмілі кулацтва як клясу. Калгасная вытворчасьць ператварылася ў моцную апору сацыялістычнага будаўніцтва.

Але хаця кулацтва разгромлена як кляса, яно не дабіта яшчэ. Яно вядзе супроць нас барацьбу. Кулак, як сказаў тав. **Сталін,** «перайшоў ад простай атакі супроць калгасаў да работы ціхай сапай». Кулак вядзе галоўным чынам барацьбу з намі ня столькі па-за калгасамі, колькі ўнутры калгасаў. Гэта тым больш лягчэй яму, што на шы камуністы на вёсцы, на жаль, не зразумелі новага ў вёсцы.

Тав. **Сталін** у сваёй прамове на пленуме ЦК, апублікаванай сёньня ў газэтах, сапраўды найвялікшай праграмнай прамове, даў найглыбейшы тэарэтычны і практычны аналіз і ўскрыў, як гэта рабіў **Ленін,** з усёй рэзкасьцю і вострасьцю ўсе недахопы нашай работы ў вёсцы.

Тав. **Сталін** указаў, што нашы вясковыя работнікі, дый ня толькі вясковыя, ня здолелі ўлічыць новай абстаноўкі.

Якія асноўныя праяўленьні клясавай барацьбы ў вёсцы? Перш за ўсё—гэта арганізатарская роля кулака ў сабатажы збожжазагатовак і сяўбы,—гэта галоўнае і асноўнае.

Па-другое,—арганізацыя гаспадарчага шкодніцтва ў калгасах і саўгасах, пачынаючы ад сяўбы і канчаючы збожжазагатоўкамі і пачынаючы, скажу, з калгасу і канчаючы некаторымі цэнтральнымі зямельнымі органамі.

Па-трэцяе,—арганізацыя падрыву працадысцыпліны ў калгасах і саўгасах.

Па-чацьвертае, адна з магутных зброй барацьбы кулака, выкарыстоўваючага традыцыі старога дробнага ўласьніка—учарайшага аднаасобніка—гэта арганізацыя раскрадваньня калгаснай і саўгаснай грамадзкай сацыялістычнай уласнасьці.

І на базе ўсяго гэтага спробы процідастаўіць інтарэсы калгасу і нават саўгасу інтарэсам пралетарскай дэяржавы, спробы ператварыць калгас у арганізацыйную форму антысавецкіх элементаў для барацьбы з пралетарскай дэяржавай.

Нашы недахопы выкрыліся з асаблівай вострасьцю ў гэтым годзе на прыкладзе збожжазагатовак. Вы ведаеце, што хлеб быў заўсёды тым асялком, на якім правяралася наша сіла і наша слабасьць, на якім правяралася сіла і слабасьць нашага ворага. Так было з самага пачатку рэвалюцыі, бо хлеб зьяўляецца асновай усяго.

Што мы, мелі ў гэтым годзе? У гэтым годзе мы маем большыя труднасьці ў збожжазагатоўках, чым у мінулым, 1931 годзе, ня гледзячы на тое, што ўраджай быў ня горшы леташняга году, а нават лепшы.

На жаль, нашы камуністы ня ўлічылі, што калгасны гандаль мае ня толькі станоўчыя, але і адмоўныя бакі. Адмоўны-ж бок заключаецца ў тым, што калгасны гандаль выклікае імкненьне ў калгаснага сялянства, пры дзьвёх цэнах па збожжа, як адзначыў т. **Сталін,** паболыш прадаць на рынку, і паменш здаць дзяржаве.

Нашы камуністы ня здолелі сваім арганізаваным палітычным уплывам паралізаваць гэты адмоўны бок калгаснага гандлю і забясьпечыць выкананьне дзяржаўнага пляну збожжазагатовак.

Кляса вораг улічыў гэту новую абстаноўку, ён аказаўся спрытней многіх нашых арганізацый, ён скарыстаў і сыграў на слабых струнках калгасьніка, не перамогшага яшчэ дробнаўласьніцкіх прывычак. Калі некаторыя камуністы прабуюць узваліць сваю віну на калгасы, дык яны робяць памылкова. Калгасьнік можна стаіць за нас. Пры правільным кіраўніцтве ён можа быць вельмі акуратным у адносінах сваіх абавязкаў да дзяржавы. Калектывізацыя зараз моцная ў вёсцы, як ніколі. Зараз не пачуеш гутараж супроць калгасу. Але найменьне, а ў некаторых выпадках нескаланьне з боку камуністаў арганізаваць па-сапраўднаму справу збожжазагатовак прывяло да таго, што збожжа часта хавалася. Ясна, зразумела, што калі райкомы і нават некаторыя крайкомы ўпалі ў такую памылку, як стварэньне фондаў замест збожжазагатовак, дык гэта не магло не знайсьці адлюстраваньня ў калгасе. У гэтым пераконваюць сотні прыкладаў з ходу збожжазагатовак.

У часе паездкі па Паўночным Каўказе ў Каменскім раёне мне прышлося сустрэцца з калгасам «Камінтэрн» дзе 9 тыс. пудоў збожжа не абмалочана, калі 3.000 пудоў збожжа раскрадзена, бо пакладзі збожжа не ў калгасным сьвірне, які пуставаў, а па індывідуальных сьвірнах калгасьнікаў. У чым жа справа? Аказваецца, з 7 членаў праўленьня—5 былых белагвардзейцаў, былых падхарунжымі ў белай арміі, у «актывае» калгасу—14 падхарунжых.

Зразумела, клясавы вораг працуе і стараецца скарыстаць усе свае сілы. Ён зусім сьвядома арганізуе шкодніцтва ў зярацоўцы палёў, у ворыве. Рад арыштаваных кулакоў расказвалі адкрыта аб тым, што яны арганізавалі ворыва ў слубу з агрэхамі, як раскрадвалі насеньне і сеялі на адзін гэктар замест 7-мі пудоў 4 пуды.

Кулакі арганізуюць падрыў працоўнай дысцыпліны ў калгасах. Адзін з арыштаваных шкоднікаў—кулак, напрыклад, расказаў:

«У калгасе «Червоний прапор» была перадавая партызанская брыгада. Яна славілася на ўсю станіцу сваёй узорнасьцю, яна выцягвала іншых. Я папрасіўся ў гэту брыгаду. Я адмовіўся быць брыгадзірам, бо брыгадзіра лягчэй злавіць, але дабіўся таго, што быў выбран вучотчыкам брыгады». І, працуючы вучотчыкам, ён разлажыў гэту брыгаду. Брыгаду распусьцілі, і ў райкому і ў ячэйкі хапіла па гэта сіл. Гэта лёгка. А вось для таго, каб распазнаць дзеяньне клясавага ворага, не дапусьціць раз лажэньня дасканалай брыгады, якая славілася сваёй работай ня толькі на адну станіцу, але на цэлы круг,—на гэта не хапіла мудрасьці. Мясцовыя камуністы аказаліся прастафілямі, пільнасьці не знайшлося, праявілася найменьне выкрыць сапраўднага клясавага ворага.

На выкладзе збожжазагатовак мы бачым, як клясавы вораг зьмяняе зараз тактыку. Яго тактыка заключаецца ў тым, каб не выступаць супроць калгасу. Надвор рот, ён уступае ў калгас, каб разбурыць яго. Гэта трэба ясна разумець. Нэйтральных калгасаў у СССР быць ня можа, таксама як ня можа быць нэйтральных прафсаюзаў, нэйтральных саветаў.

Хоць мы ў Маскоўскай воблаcьці і скончылі збожжазагатоўкі і загатоўкі бульбы і ільну, аднак, ня шкодніць тут указаць, што і ў нашай арганізацыі мы маем факты, калі некаторыя камуністы аказаліся на поваце ў элементаў, зрываўных выканань не дзяржаўных абавязкаў калгаснікамі. Напрыклад, у Яфрэмаўскім раёне. Так што захапляцца ня варта і нам. Недахопы і труднасьці ў нас вялікія.

Там, дзе на чале калгасу стаіць добры камуніст, там, дзе гэты камуніст сапраўды змагаецца за калгас, ёсьць выкананьне пляну збожжазагатовак і ўсіх дзяржаўных заданьняў, там калгас—крэпасьць сацыялізму. Там, дзе дрэнны камуніст, дрэнны кіраўнік, там, дзе камуністы цягнуцца ў хвасьце,—там калгас ператвараецца ў зброю ворага. Значыцца, усё пытаньне ў тым, каб калгасам кіраваць па-бальшавіцку. Бо калі мы ім ня кіруем, дык ім кіруе клясавы вораг, таксама як і саветам, калі ім кіруе камуніст, і добры камуніст, то саўвет адказвае свайму прызначэньню органа пралетарскай дыктатуры; калі гэтага няма, то савет можа аказацца супроць савецкай улады.

Нашы калгасы—сацыялістычная форма прадпрыемстваў, гэта ня значыць, што мы павінны ідэалізаваць калгасы. А ў нас некаторыя камуністы недамагаюць ідэалізацыяй калгасаў. І тут асабліва важна тое, што падкрэсьліў у сваёй прамове тав. **Сталін:** разрозьненыя індывідуальныя гаспадаркі сялян былі аддзелены адна ад другой. Сёньня мы ў асноўных раёнах маем суцэльную калектывізацыю. У гэтых умовах нам трэба быць выключна пільнымі, бо клясавы вораг, які пралазіць у калгасы, можа скарыстаць іх як легальнае прыкрыцьцё для сваіх падпольных арганізацый.

У асобе калгасаў мы маем дасканалую форму арганізацыі. Але трэба, як сказаў у сваёй прамове тав. **Сталін,** гэту форму напоўніць сацыялістычным зьместам. У гэтым — стрыжэль. А нашы камуністы ідэалізавалі калгасную форму: калі форма сацыялістычная — усё сама сабой дана. Не, усё сама сабой не дана, бо «калтсьнікі па становішчы ўжо не аднаасобнікі, а калектывісты, але сьвядомасьць у іх пакуль што яшчэ старая, прыватнаўласьніцкая» (Сталін).

Адсюль і праяўленьне рвацтва і праяўленьне раскрадваньня і расьцягваньня грамадзкай уласнасьці, адсюль і процідастаўленьне калгасу пралетарскай дзяржаве.

Важнейшая задача — змагацца за большасьць у калгасе, за бальшавіцкі калгас, за наша сапраўднае камуністычнае кіраўніцтва ў калгасе. Гэта дыктуецца задачамі нашай работы ў вёсцы. Калгасы ня толькі не зьмяншаюць, а павялічваюць нашы клопаты аб сельскай гаспадарцы, павялічваюць нашу адказнасьць за вёску.

Галоўная задача стваравемых палітаддзелаў у МТС і саўгасах і заключаецца ў першую чаргу ў арганізацыйным умацаваньні калгасаў. Мы павінны ператварыць МТС і саўгасы ў сапраўдныя вагары гаспадарчага і палітычнага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

Палітаддзелы ў МТС і ў саўгасах павінны быць у пэўнай меры партыйным вокам. Гэта ня значыць, зразумела, што нашы дырэктары саўгасаў і МТС адмываюцца на пазыцыі спэцаў. Не. Гэта толькі значыць, што у адных да тых-жа задач будзе адзін пункт падыходу, а ў другіх—другі пункт падыходу, а ў другіх—трэці пункт падыходу. Дырэктары будуць падыходзіць з боку тэхнічнага, гаспадарчага, а палітаддзельцы падыходзіць да тых-жа задач з боку палітычнага. Яны будуць адзін аднаго падмацоўваць, адзін аднаго ўзаемна дапаўняць. Зразумела, не абыдзецца бяз спрэчак аб узаемаадносінах.

Але ў пастанове ЦК сказана ясна, што адзначальнае ў нас павінна быць непаруш на, што палітаддзелы дапаўняюць гаспадарчую работу МТС і саўгасаў. Мала стварыць палітычны орган. Мала паставіць палітаддзелы. Трэба палепшыць і самое гаспадараньне.

Тэхніка шчыльна зьвязана з палітыкай. Возьмем да прыкладу ворыва з агрэхамі. Як быццам-бы сувязі яе з палітыкай няма, бо аруць трактары з плугамі, але аруць дрэнна таму, што, па-першае, шкодзікі сьвядома перашкаджаюць, а, па-другое, часта таму, што ў асобных несьвядомых элементаў праяўляюцца злачынныя адносіны да калгаснай працы, пасылаюць замест сябе араць дзяцей. Плуг, зразумела, скача і замест таго, каб араць у глыбіню, ён па паверхні скача.

Вось вам як барацьба са шкоднікам, перамаганьне дробна-ўласьніцкіх адносін да калектыўнай працы і гаспадаркі, умацаваньне працоўнай дысцыпліны, арганізацыя мас і тэхніка — апрацоўка зямлі, ворыва, — зьвязваюцца ў адно.

Або возьмем для прыкладу запасныя часткі да трактараў. Запасных частак не хапае. Цэнтральны камітэт увесь час займаецца імі, і зараз. Наркамцяжпрам мабілізуе ўсе сілы для таго, каб даць большую колькасьць запасных частак. Але апрача нястачы запасных частак ёсьць факты галавацяпскай, а часамі і шкодніцкай засьлкі запасных частак ня туды, куды трэба, і, па-другое, — разгільдзяйскія адносіны да трактараў і злачынная паломка трактарных частак.

Калі я быў у саўгасе «Гігант», то мне скардзіліся, што радыятары палопаліся. Пытаю трактарыстаў: чаму палопаліся? Звальваюць на тое, на другое, толкам не гавораць. Потым ужо высьветлілі, што радыятары палопаліся таму, што пасьля работы ваду ня спусьцілі, марозам іх прыхваціла, — вось і палопаліся.

А дырэктар саўгасу замест таго, каб праявіць усю сілу сваёй улады, якую ён мае, замест таго, каб пакараць вінаватых, замест таго, каб сумесна з прафэсыянальнымі і партыйнымі арганізацыямі мабілізаваць увагу і пільнасьць трактарыстаў, узьняць ударніцтва, — замест гэтага канстатуе паломку трактараў, лічыць гэта звычайнай справай і толькі ходзіць і «ўгаворвае» рабочых, а, вярней сказаць, балбоча з імі. Часамі ламаюць ня толькі таму, што ня ведаюць, — ламаюць сьвядома пралезшыя ў саўгасы кулакі (а іх пралезла шмат), ламаюць разгільдзяі, рвачы, і іх у саўгасах таксама шмат.

Правільна тав. **Сталін** падкрэсьліў труднасьці аўладаньня гаспадаркай, створанай за апошнія гады 200 тыс. калгасаў, 5 тыс. саўгасаў, 2.466 МТС. Ён падкрэсьліў, што нашы саўгасы і калгасы перажываюць перыяд, падобны да таго, які перажывалі нашы заводы і прадпрыемствы ў 1920-1921 г. г. З гэтых слоў тав. **Сталіна** мы павінны зрабіць той адзіна-бальшавіцкі вывад,—каб прыкладаць усе сілы да хутчэйшага асваеньня гаспадаркі і ўдарыць на нашых суб'ектыўных недахопах. Як мы пасьля 1920-21 г. мабілізавалі ўсе сілы, каб перамагчы недахопы ў рабоце прамысловасьці, як мы ўлічылі ўрокі шахцінскага шкодніцтва для палепшэньня работы нашых прадпрыемстваў, так мы павінны перамагаць існуючыя недахопы ў сельскай гаспадарцы.

Шмат недахопаў ня толькі ў калгасах, але і ў зямельных органах, пачынаючы з райЗУ і канчаючы Наркамзэмам, — аб гэтым больш падрабязна мне прышлося гаварыць у сваім дакладзе аб палітаддзелах на пленуме ЦК.

Палітаддзелы павінны важнейшай задачай паставіць выхаваньне кадраў і самае галоўнае — барацьбу з перараджэнцамі ў калгасах і саўгасах, з тымі, якія, называючы сябе камуністамі, у сапраўднасьці не змагаюцца і не вядуць бальшавіцкай барацьбы за калгасы, за саўгасы. Ёсьць дырэктары саўгасаў, якія распараджаюцца саўгасным дабром як сваёй уласнасьцю, — гэта і ёсьць буржуазнае перараджэньне.

Зараз у сельскіх ячэйках па ўсім СССР каля 800 тыс. членаў партыі. Чыстка ня вызваліць ад раду непатрэбных, часамі варожых элементаў, а таксама ад балясту. Але мы павінны нашу ідэйна-палітычную работу ў вёсцы падняць і паставіць на належную вышыню, падняць клясава-рэвалюцыйную пільнасьць усіх камуністаў у вёсцы, начынаючы ад нізавога камуніста да райкомшчыка, ідэйна узброіць іх для таго, каб у далейшым выкарчоўваць элементы апартунізму ў розных відах, у розных яго праяўленьнях. А для гэтага трэба згуртаваць вакол сябе актыў і ў першую чаргу ідэйна ўзброіць і загартаваць партыйную арганізацыю.

Задача ідэйнага ўзбраеньня камуністаў—выключна важна. Першачарговая задача ячэйкі і райкому — партыйна-масавая работа, калі партарганізацыя ня будзе згуртаванай, ня будзе ідэйна ўзброенай, ня будзе шчыльна зьвязанай з масамі, ніякая савецкая гаспадарчая арганізацыя ня зможа з посьпехам праводзіць сваю работу. Без бальшавікоў підзе ніякай работы не правядзеш. Але бальшавікі — гэта не фразоўленыя работнікі, якія час-ад-часу плююць членскія ўзносы і прымаюць «рэзалюцыі аб выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній», а баявая арганізацыя, жывы арганізм, які загартоўваецца ў схватках з ворагамі, згуртоўваецца на перамаганьні труднасьцяй, вядзе за сабой масы, расьце ў працэсе работы.

Бальшавік — ня чыноўнік, ён працуе не па загаду. Калі ён ідэйна не пераконан, калі яму ня ясны правадзімыя мерапрыемствы, калі ў глыбіні душы ў яго шавеліцца чарвячок сумненьня, — на тры чвэрткі яго работа будзе ўпустую. Магчыма, што ён сумленна захоча выканаць даручаную яму работу, будзе мітусіцца, шумець. Але карысьць ці будзе мала. Калі загад з галавы ідзе напалову аслабленым, — рука калоціцца, траціць сваю цьвёрдасьць і сілу. Вось чаму важнейшай задачай зьяўляецца ідэйнае ўзбраеньне сельскіх і раённых партарганізацый. Я гавару іменна аб узбраеньні замест звычайна ўжываемага слова — выхаваньне, бо слова ўзбраеньне дакладней выказвае тое, што нам трэба. Бальшавік — ня школьнік і марксызмам-ленінізмам аўладоўвае не для экзамэну, не для дыплёму. Ён — баец, якому рэвалюцыйная тэорыя дае «сілу арыентаваньня, яснасьць перспэктывы, упэўненасьць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы» (Сталін).

Трэба разгарнуць гіганцкую масава-палітычную работу сярод калгасьнікаў. Для гэтага трэба стварыць калгасны актыў. Зараз у большасьці выпадкаў калгасны актыў пад бірэцца фармальна, па прымеце выконваемай работы ці сацыяльнага пахаджэньня. Гэта становішча трэба зьмяніць. Трэба браць у актыў тых людзей, якія па справе ўсёй душой сваёй зацікаўлены ў калгасе, змагаюцца за калгас.

Вось у адным калгасе імя Леніна, Верхня-Іпхайскага сельсавету, Каменскага раёну, на Паўночным Каўказе, я палаў па сход праўленьня з актывам. Сядзіць камуніст—былы чырвоны партызан Красноў — старшыня рэвізыйнай камісіі. Старшыня калгасу і загалчык гаспадаркі — былыя белыя, людзі чужыя, лінію ядуць яўна на шаму.

(Працяг на 3 стар.).

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

# Працяг дакладу тав. Кагановіча

А камуніст Красноў уяўляе, нібы яго слухаюць, нібы ўважліва адносяцца да яго прапаноў. Краснова завуць па імені і па бацьку — Іван Іванавіч, а на справе ўсім камандуюць кулацкія элементы. Стараюць вытлядваецца адзінства ў калгасе. Але яно мацніравана супроць інтарэсаў пралетарскай дзяржавы і супроць інтарэсаў калгаснікаў. Вось іменна супроць такога адзінства завостран пункт пастановы пленуму ЦК аб барацьбе за большасьць у калгасе.

Нам трэба стварыць актыў, які будзе разам з намі змагацца ва ўсіх і ўсякіх выпадках, актыў, які будзе весьці за сабой асноўную масу. А што маса за намі, што калгасы ўстойлівыя, як ніколі, — гэта бясспрэчна. Не гаворачы ўжо аб тым, што мы за апошні час ня маем выхадаў з калгасаў, не гаворачы ўжо аб тым, што мы маем, наадварот, прыліў у калгасы ў цэлым радзе абласьцей, мы бачым у вёсцы такое становішча зараз, калі вы ня чуеце голасу супроць калгасу. Нават тыя паасобныя элементы, якія супроць калгасу, і тыя вымушаны прыстасоўвацца і рабіць выгляд, што яны за калгас.

Асноўны недахоп многіх цяперашніх райкомаў у павархоўным падыходзе, у пекапкрэтным кіраўніцтве калгаснымі ячэйкамі.

Гэты недахоп у кіраўніцтве вёскамі і калгасамі трэба ў корані выправіць. Сэнс стварэньня палітаддзелаў заключаецца, між іншым, у тым, што калі мы пры ліквідацыі акруг падышлі шчыльна да раёну, калі мы зараз маем магчымасьць ня толькі з края вога цэнтру, ня толькі з рэспубліканскіх цэнтраў, але і ад ЦК УсеКП(б), проста даходзіць да раёнаў, выклікаць сакратароў раёнаў, з імі гутарыць, выпраўляць іх памылкі, дык зараз мы павінны дайсьці да вёскі, да калгасу, да пізавых камуністаў.

Такім чынам, нашы задачы ў вёсцы зводзяцца да таго, каб хутчэй перабудавацца, аказацца спрытней ворага, здолець умацаваць грамадзкую, сацыялістычную ўласнасьць. Дакрэт, які выдан аб сацыялістычнай уласнасьці, — гэта вялізарнейшы дэкрэт. Гэта лінія нашай работы ў вёсцы, асноўнае зьвяно ў барацьбе з ворагам, які раскрадвае калгасную і саўгасную ўласнасьць.

Мы зможам арганізаваць справу ў калгасах, калі ўзмоцнім кадры. Яны ў нас ёсьць, іх трэба падабраць і арганізаваць. Я бачыў сотні таленавітых людзей з асяродзінча калгаснікаў, якія навучыліся кіраваць, таленавітых людзей у нас сотні тысяч у калгасах і саўгасах. Іх трэба ведаць, выхаваць і арганізаваць.

Нам трэба правільна расставіць свае сілы ў вёсцы. Мы павінны ідэйна ўзброіць камуністаў. Зараз ЦК рэарганізаваў Сьвярдлоўку і іншыя камуністычныя навучальныя ўстановы. Гэта дасьць нам сур'ёзныя кадры для вёскі, але ня трэба абмяжоўвацца толькі камвузамі. Мы можам многіх і многіх з ліку нашых лепшых людзей, пісьменных, культурных, у тым ліку і нашых прафэсароў, накіраваць у вёску — няхай яны там у вёсцы на справе выхаваюць масы і дастасуюць да жыцьця свае веды марксызму-ленінізму. **(Аплёдысмэнты).**

Я думаю, таварышы, што пры правільнай пастаноўцы нашай работы, больш таго, пасьля тых ясных і выразных указаньняў, якія дала партыя на гэтым пленуме, пасьля таго, як партыя выкрыла па-бальшавіцку нашы недахопы з выключнай рэзкасьцю, дальнабачнасьцю, з выключнай выразнасьцю і па-сапраўднаму, па-ленінску паставіла ня толькі задачы, а і намецілі таксама мэтады падыходу да іх выраўнаньня, як гэта зрабіў тав. **Сталін** у апублікаванай сёньня прамове, — мы ўпэўнены, што ўсе труднасьці, якія стаць у вёсцы, мы пераможам пры правільным шляху мабілізацыі нашых сіл для апошняй перамогі над клясавым ворагам, які застаўся яшчэ сёньня ў вёсцы. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

## IV. Унутрыпартыйныя пытаньні

Таварышы, перабудова работы ў вёсцы, якая намечана й павінна будзе праводзіцца ў вёсцы, зьяўляецца працягам тэй агульнай перабудовы работы органаў пралетарскай дыктатуры, якую партыя прадпрыняла ў пачатку першай пяцігодкі. Нашы перамогі былі забясьпечаны перабудовай работы ўсіх нашых арганізацый і ў першую чаргу самой партыі прыстасоўна да задач рэканструкцыйнага перыяду. На XVI партызьезьдзе ён фармуляваў гэта ў сваім тэзісе аб сутнасьці бальшавіцкага наступленьня. Тав. Сталін указаў тады, што сутнасьць бальшавіцкага наступленьня заключаецца ў тым, каб разьбіць ворага, каб разьбіць апартуністаў унутры партыі, каб арганізаваць перабудову ўсёй практычнай работы. Партыя арганізавала і правяла перабудову работы ўсіх органаў пралетарскай дыктатуры, пачаўшы яе з перабудовы сваіх уласных радоў. Як вы ведаеце, перабудову сваіх радоў партыя пачала з лёзунгу аб самакрытыцы. Бальшавіцкае разгортваньне самакрытыкі мабілізавала актыўнасьць партыі і перадавых рабочых вакол задач пяцігодкі. Асноўнай кавой перабудовы партыі была прамова тав. **Сталіна** «Па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць» (пра шасьць умоў). Гэта прамова была сьцягам барацьбы рабочай клясы за перамогу першай пяцігодкі. Партыя павярнула ўсе свае арганізацыі і ўсе арганізацыі рабочай клясы «тварам да вытворчасьці». Ці памятаеце вы, калі ў нас, у Маскве, да XVI зьезду партыі было ўсяго толькі каля палавы камуністаў, ахопленых ударніцтвам? Зараз ужо аб гэтым забылі, бо хоць і зараз ёсьць паасобныя лінавыя ўдарнікі, мы маем пагалоўны ахоп камуністаў сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Лёзунг тав. **Сталіна** аб аўладаньні тэхнікай зьявіўся зьместам работы ўсіх арганізацый партыі і рабочай клясы. Перабудова партыйнай работы на трэскапарце; ліквідацыя акруг і наближэньне да раёнаў; перабудова партыйнага апарату прыстасоўна да гэтых задач; у адпаведнасьці з задачамі калгасаў, перабудова вясковых партыйных арганізацый, канкрэтнае кіраўніцтва, праверка выкананьня; перабудова савецкага, дзяржаўнага апарату, — такавы асноўныя лёзунгі перабудовы.

Партыя паставіла і з посьпехам вырашае праблемы стварэньня з людзей рабочай клясы кадраў спэцыялістаў. Мы мелі ў ВТНУ і ВНУ 166 тыс. чал., сёньня мы маем 500 тыс. чал. Пайдзеце на любы завод і вы ўбачыце там маладых людзей—інжынэраў, якія кіруюць вытворчасьцю. Часамі яны дрэнна яшчэ працуюць, ня маюць яшчэ вопыту, але гэта ўжо нашы людзі, наша пралетарская інтэлігенцыя. Партыі стварыла моцны кадр гаспадарчых кіраўнікоў, хаця ў вёсцы над гэтай задачай прадстаіць шмат яшчэ папрацаваць. Арганізацыя ў нас яшчэ адстае ад палітыкі і руху мас, але партыя ўсю гэту работу па перабудове вяла і вядзе з дня ў дзень у строгай адпаведнасьці з усёй сваёй палітычнай лініяй у барацьбе з усякімі ўхіламі ад ленінізму, і асабліва з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай.

Посьпехаў пяцігодкі партыя дабілася, галоўным чынам, таму, што яна вяла правільную ленінскую палітыку. Партыя разграміла ворагаў, бязьлітасна выкітваючы апартуністаў са сваіх радоў. Яна стройнымі радамі прайшла ўвесь шлях першай пяцігодкі.

Для таго, каб ажыцьцявіць гэту вялікую справу пяцігодкі, трэба было расчысьціць шлях, прачысьціць мазгі, мабілізаваць людзей. Для таго, каб мабілізаваць людзей, трэба растлумачыць і вызначыць шлях, па якім мы ідзем,—а тлумачальнікаў Леніна ўсярэдзе і наўскос было шмат. Многія прабавалі растлумачыць Леніна па-свойму, апартуністычна. Вось чаму партыя да канца вы крыла трацкісцкія тэорыі аб тым, што НЭП ёсьць адсечка ў мэтах чаканьня між парожнай рэвалюцыі, што без міжнароднай рэвалюцыі аб перамозе пралетарыяту думаць нельга, што ў рамках адной краіны ні аб якім будаўніцтве сацыялізму сур'ёзна гаварыць, не ўпадаючы ў нацыянальную абмежаванасьць, нельга, што сялянства ў цэлым—вораг сацыялізму, што з ім сацыялізму не пабудуеш. На гэтым будавалася тэорыя дзяржаўнага капіталізму, якая адмаўляла сацыялістычны характар нашых дзяржаўных прадпрыемстваў, тэорыя аб тым, што НЭП—гэта адступленьне, а калі ўжо адступаць, дык ва ўсякім выпадку з «гонарам», або, іншымі словамі, «чэснэ», без барацьбы, бяз спроб будаваць якісьці там «сацыялізм» здаць капіталізму свае пазыцыі.

Ні аб якай перамозе яны і ня думалі, усе іх фразы аб эвышіндустрыялізацыі—усё гэта глупства. Эвышіндустрыялізм трацкістаў аказаўся пустой фразай, для іх гэта было сродкам барацьбы супроць партыі.

Партыя выкрыла іх тэорыі, даказаўшы, што яны супроць індустрыялізацыі, супроць калектывізацыі, супроць будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

У той час, як т. **Сталін** абараняў і абараняў тэорыю і практыку пабудовы сацыялізму ў адной краіне, знайшліся людзі, якія сядзелі спакойна і гаварылі: «Ну, што-ж, калі пабудова сацыялізму ў адной краіне забясьпечана, значыць, ня трэба хвалявацца, давайце чакаць спакойна»

І яны спакойна чакалі, спадзяючыся на самацёк.

Калі трацкісты даказвалі, што ўсё сялянства—вораг сацыялізму, дык правыя ўхілісты меркавалі, што ўсё сялянства ў цэлым—прыяцель сацыялізму, што, значыцца, пры ўсіх умовах усё сялянства будзе будаваць разам з намі сацыялізм. Адсюль вынікала тэорыя грамадзянскага міру, тэорыя ўрастаньня кулака ў сацыялізм, тэорыя прыстасаваньня выключна ганцлёвай змычкі гораду і вёскі. І калі ў 1928 г. кулак, супраціўляючыся сацыялістычнаму будаўніцтву, патрабаваў плаціць яму 15 руб. за пуд збожжа, прабаваў сарваць збож жазагатоўкі, дык партыя прымусіла яго даць збожжа рабочай клясе па цвёрдай цане. Правыя ўхілісты ўзвылі. Яны стаялі на пазыцыі такога ганцлю, які дапускаў стыхійную гульню цэн на рынку, і гэта яны выдавалі як разьвіцьцё форм змычкі, на справе-ж яны былі за разьвіцьцё кулацкай гаспадаркі, на словах за лібэральнае «абмежаваньне» разьвіцьця капіталізму. Іх тэорыя і палітыка вялі да рэстаўрацыі капіталізму.

І правыя і трацкісты зусім не зразумелі вялікай пераўтваральнай рэвалюцыйнай ролі пралетарскай дзяржавы, яны адмаўлялі ролю суб'ектыўнага фактару ў справе пабудовы сацыялізму, яны ў корані сказілі ленінскае вучэньне аб узаемаадносінах палітыкі і эканомікі. Яны адмаўлялі, што пры правільнай палітыцы, ня гледзячы на тое, што наша дзяржава акружана з усіх бакоў капіталістычнымі краінамі, ня гледзячы на тое, што ў нас пераважае дробная сялянская гаспадарка, ня гледзячы на ўсё гэта, пры правільнай палітыцы, пры мабілізацыі волі, энэргіі, энтузіязму, пафасу мільёнаў мы можам будаваць і пабудуем сацыялізм у нашай краіне. У гэтым сутнасьць. Мы можам будаваць і пабудуем новыя гіганты.

І трацкісты і правыя сталі на шлях меншавізму, які адмаўляе пралетарскі характар Кастрычніцкай рэвалюцыі. Калі-б мы з вамі пяцігодку не ажыцьцявілі, калі-б мы не даказалі, што мы заводы будаваць можам, калі-б мы не маглі перабудаваць эканоміку краіны, тады ўвыйдзе пытаньне: навошта змагаліся на барыкадах? Навошта столькі крыві праліта, навошта мы галадалі, вялі крывавапрэтную грамадзянскую вайну? Калі было-б даказана, што мы сацыялізму пабудаваць ня можам, тады выходзіць—царызма мы ўвесь агарод гарадзілі. Вось чаму, таварышы, наша партыя расчысьціла шлях для мабілізацыі мільёнаў на новую вялікую справу. Вельмі цяжка ў дробнабуржуазнай краіне, дзе мошна дробнабуржуазная стыхія, дзе пралетарыят непаматлікі, дзе ўплыў дробнабуржуазнай ідэалёгіі вялікі,—у гэтай краіне весьці правільную пралетарскую палітыку вельмі цяжка. Гэту палітыку трэба заваяваць у барацьбе. Партыя па-бальшавіцку вытрымала экзамэн, у барацьбе яна абаравіла сваю пралетарскую, ленінскую палітыку ад апартуністычных наскокаў. Гэту барацьбу мы правялі з посьпехам таму, што яе арганізаваў, ёю кіраваў і тэарэтычна і практычна іменна т. Сталін. Іменна таму ворагі яго атакуюць больш за ўсё, таму партыя ўсё пчыльней згуртоўвалася і згуртоўваецца вакол яго.

Напісаць рэзалюцыю, атрымаць большасьць, вынесьці рашэньне, што трэба будаваць буйныя заводы,—гэта далёка яшчэ ня ўсё. А стварыць пяцігадовы плян грандыёзных работ і гэты вялікі плян сацыялістычнай будоўлі ажыцьцявіць—гэта значыць на больш цяжкая справа. Пры ўсім нашым імкненьні і жаданьні ацэніць па вартасьці грандыёзнасьць гэтых перамог пяцігодкі, мы ўсё-ж, думаю я, пакуль, бадай, ня ў стане поўнасьцю ахапіць усёй велічы перамог пяцігодкі. Бадай, праз некалькі год нам стане ясьнейшай уся грандыёзнасьць гэтых перамог, таксама, як зараз нам больш ясная становішча грандыёзнасьць перамог у Кастрычніцкія дні, калі невялікая партыя, якую вось-вось хацелі пасадзіць у турму, стала на чале вялізарнай дзяржавы, акружанай з усіх бакоў ворагамі, або грандыёзнасьць перамог у грамадзянскай вайне, калі нашы дронна ўзброеныя арміі рабілі цуды.

Тав. **Сталін** у сваім выключна ясным, як заўсёды, выключна выразным і вялізарным па сваім размаху прадбачаньня дакладзе асьвятліў тыя перамогі, якія мы атрымалі ў гэту пяцігодку. Часамі гавораць: так, правільна, вы дабіліся перамог, але ці нельга было гэтых перамог дабіцца як-небудзь палягчэй? Пяцігодку мы заваявалі, перамагаючы труднасьці клясавай барацьбы і нашага росту. Ня проста труднасьці, а катастрофу рэвалюцыі мелі-б мы, калі-б мы іншымі шляхамі. Што было-б з намі пры нашай слабасьці і пры няўхільным, у выніку гэтага, наступленьні кулака, ушчэ ранога капіталізму, пры пагрозе вайны, інтэрвэнцыі?

Будучы ў вёсцы на Паўночным Каўказе, я сабраў групу камуністаў для гутаркі і па пытаў: таварышы, як вы разумееце труднасьці? Адказвалі розна. Адна малапісьменная калгасніца, удава, у адказ на пытаньне: «Ці ня лепш было-б расьцягнуць тэрміны пяцігодкі на 10 год? Капіталу ў нас няма, ніхто нам не дае пазык з замежаў, рабаваць, як гэта робяць амэрыканскія, англійскія і францускія імпэрыялісты, мы не рабуем, жалёзнай у нас няма,—значыцца, мы будуем за колт сваёй капейкі, працоўнай капейкі рабочых і сялян, а затрацць трэба было мільярды рублёў, ды да таго-ж яшчэ і золата. Можа быць, пытаю я, трэба было замест 5-ці год будаваць 10 год, было-б лягчэй?» Яна падумала, падумала і гаворыць: «Ведаеце, таварыш, а так думаю, можа можна было-б у 10 год, але калі-б кулак-тад пачакаў **(сьмех, аплёдысмэнты)...** а то ёнжа ня будзе чакаць. Мы разьвіваемся, і ён будзе разьвівацца і капітал між народны будзе разьвівацца. Дзесяць год, а хто яго ведае, хто абгоніць, а можа ён нас перагоніць. Дзесяць год чакаць нельга. Трэба было хутчэй умацавацца, а то спазьніцца можна—укакошаць».

Малапісьменная калгасніца адказала карацей і прасьцей, чым гэта зрабілі-б некаторыя вучоныя прафэсары. **(Сьмех, аплёдысмэнты).**

Трэба было стварыць моцную эканамічную базу для таго, каб ліквідаваць адсталасьць і стварыць нашу незалежнасьць ад замежнага капіталу, і партыя яе стварыла ў барацьбе ня толькі з адкрытым клясавым ворагам, але і з яго агентурай унутры партыі.

Я ня буду тут паўтараць усю гісторыю барацьбы з трацкізмам, з правымі ўхілістамі, з прымірэнцамі, з права-лівацкім блёкам і г. д. Майстэрства нашага кіраўніцтва, майстэрства Цэнтральнага камітэту, майстэрства т. **Сталіна**, перш за ўсё, заключалася і заключаецца ў тым, што яны ўмеюць ня толькі высоўваць лёзунгі, а палеінску, канкрэтна біцца за ажыцьцяўленьне гэтых лёзунгаў, па-ленінску біцца за генэральную лінію. Партыя разьбіла ўшчэнт і трацкістаў, і правых ухілістаў, і ўсякія іншыя ўхілісцкія элементы. Зараз кожны гатовы клясьціся ў вернасьці генэральнай лініі. Але зараз справа заключаецца ў тым, каб глядзець, як на практыцы, у практычнай палітыцы і рабоце людзі змагаюцца за ажыцьцяўленьне лініі партыі. Адданасьць камуніста справе партыі правяраецца яго работай, яго барацьбой за практычную палітыку партыі.

Мы правядзём далей вайну са сваім клясавым ворагам за сацыялізм ня толькі ў нас, унутры краіны, але і ў міжнародным маштабе. Партыя павінна быць маналітнай.

Нядаўна была выкрыта контр-рэвалюцыйная групоўка Руцкіна—Сьлянкова, частка з іх была ў партыі, галасавала за лінію партыі, а на справе выявілася, што гэта агал целае кулачо, якое дагаварылася нават да таго, каб распусьціць калгасы, скаціцца на шлях простай контр-рэвалюцыі. Адзін з прыхільнікаў гэтай групы дагаварыўся да таго, што прапанаваў закрыць трактарныя заводы, спыніць пасылку ў вёску трактараў. Партыя з усёй рашучасьцю выкрыла гэту групоўку.

Зараз, вы ведаеце, выкрылася новая антыпартыйная групоўка Эйсмонта—Талмачова—Сьмірнова. Сацыяльны сэнс гэтай групоўкі заключаецца ў тым, што яна аллю справала сабой злобнасьць клясавага ворага. Эйсмонт, Талмачоў—гэта людзі, якія прапаведвалі погляды звароту да кулацкай гаспадаркі, адмаўленьня ад калгасу і саўгасу. Калі правыя ўхілісты па першым эта пяцігодкі аллюстроўвалі сабой больш магутнае, больш актыўнае і больш моцнае супраціўленьне кулака і, значыцца, яны выступалі адкрыта, проста, з разгорнутай праграмай, з разгорнутым пляном, дык зараз сілы кулака падбіты, ён разгромлен, прыцьшлен. Вось чаму больш скрэмна выступаюць новыя групоўчыкі, якія не даюць нават зьвяснай плятфармы. Аднак, у сваіх арганізацыйных мэтах яны аллюстроўваюць суцярагі дабіваемага намі ворага і скочваюцца на шлях контр-рэвалюцыйнай барацьбы з партыяй.

Іменна таму партыя строга аднеслася да арганізатараў гэтай групы—Эйсмонта і Талмачова выключыла з партыі, а Сьмірнова—з ЦК, даўшы яму апошнюю магчымасьць паправіцца ў радох партыі.

У адносінах Рыкава і Томскага пленум прыняў пастанову, у якой, як вы ведаеце, указана, што яны стаялі ў баку ад барацьбы з антыпартыйнымі элементамі. Больш таго, сваімі сувязямі з ленінымі з гэтай групоўкі яны давалі магчымасьць разьлічваць на сваё падтрыманьне гэтай групоўкі.

Іменна таму пленум ЦК патрабаваў ад былых лідэраў правай апазыцыі Томскага і Рыкава канчатковай зьмены сваіх паводзін.

Вы чыталі, бадай, прамовы т. т. Бухарына, Рыкава і Томскага, апублікаваныя ў газэтах. Людзі, якія выступалі супроць Цэнтральнага камітэту, зараз самі прызнаюць, што іх палітыка правалілася, што іх палітыка азначала-б рэстаўрацыю капіталізму, прызнаюць зараз самі, што перамога пяцігодкі ёсьць вялізарнейшая перамога нашай партыі і супроць правых ухілістаў, што правыя ўхілісты адкрыта змагаліся супроць партыі, супроць Цэнтральнага камітэту, супроць т. Сталіна і не таму, што Цэнтральны камітэт дрэнны, не таму, што т. Сталін дронны, а таму, што Цэнтральны камітэт на чале з т. Сталіным наступаў на кулака. А яны, былыя лідэры правых ухілістаў, вялі палітыку абароны кулака. Але, таварышы, справа зараз ня столькі ў выступленьнях і не ў прамовах. Справа зараз у тым, каб на практыцы, у штодзённай рабоце на сваім вучастку ўмець змагацца і праводзіць лінію партыі. Толькі на падставе гэтага ацэньваецца зараз кожны камуніст. Будзем чакаць, каб яны на рабоце змаглі-б стаць сапраўднымі правадзінкамі нашай палітыкі. Мы не павінны аслабляць пільнасьці. Людзей, якія набывалі ва ўсякіх групоўках, трэба больш строга правяраць.

Гэта ўжо абавязкова. Гэта асабліва відаць на прыкладзе раду трацкістаў. Вы-ж ведаеце, што ў нас шмат былых трацкістаў уступілі ў партыю, падалі заяву, нібы пры зналі свае памылкі, а на справе рад з іх двурушнічалі, на справе вялі падпольную работу супроць партыі, супроць савецкай дзяржавы.

Вось чаму, таварышы, мы павінны з вамі зараз быць выключна пільнымі, выключна на варце, змагацца з двурушніцтвам, змагацца з апутаньствам ва ўсіх яго праяўленьнях, бо толькі гэта можа даць нам перамогу.

Мы павінны зараз падрыхтавацца да чысткі партыі. Чыстка партыі, абвешчаная Цэнтральным камітэтам, павінна вызваліць партыю ад ненадзейных, нестойлівых і прымазаўшыхся элементаў. Партыя нашна вельмі разраслася. Многія вельмі захапіліся ростам партыі: не абавязкова нам мець 3 з паловаю мільёны членаў і кандыдатаў, сумленныя людзі, якія не адчуваюць у сабе сілы быць у партыі, няхай працуюць вакол партыі, як беспартыйныя актывісты. Партыю нашу трэба трымаць у чыстаце, партыя павінна атраджаць сябе, яна стаіць на чале ўлады, тым больш, што наша партыя —адзіная ў краіне, у гэтым наша сіла, калі мы няправільна гэтай сілай будзем карыстацца, могуць праявіцца і адмоўныя моманты. Мы павінны жыліка ў партбілетамі ў кішэні, чукаедаў і паразытаў вычышчаць з партыі і весьці з імі жорсткую барацьбу.

Дакрэт аб ахове грамадзкай сацыялістычнай уласнасьці цалкам прыстасоўны і да гэтых жулікаў з партбілетамі ў кішэні.

Перад намі ў вёсцы і ў горадзе стаіць задача павысіць рэвалюцыйную пільнасьць, умець выкрыць ворага і яшчэ больш узмацніць рэвалюцыйную магутнасьць пралетарскай дыктатуры.

Клясавая барацьба ў нас ня толькі не аслабляецца, яна набывае яшчэ больш абвостраныя формы.

Для нас ясна, што па меры нашага росту, па меры таго, як мы клясавага ворага зьнішчаем, ён ня толькі не аслабляе свайго супраціўленьня, а шалёна, хаця і будучы аслабленым і ня маючы сіл адкрыта выступіць, яшчэ больш азлоблена дзейнічае ўсімі шляхамі супроць нас.

***

Вось чаму, таварышы, мы не павінны з вамі аслабляць магутнасьць пралетарскай дыктатуры, магутнасьць пралетарскай улады і яе ўдар па ворагу, бо задача зьнішчэньня клясаў, якую мы перад сабой паставілі, нямінуча выклікае абвастрэньне клясавай барацьбы, у якой супраціўленьне ворага будзе зломлена тым хутчэй, чым з большай сілай выявіцца магутнасьць пралетарскай дыктатуры.

**Ленін** гаварыў яшчэ ў «Детской болезни левизны в коммунизме»:

«Зьнішчыць клясы—значыць ня толькі прагнаць памешчыкаў і капіталістаў —гэта мы параўнальна лёгка зрабілі, —гэта значыць таксама **зьнішчыць дробных таваравытворцаў**, а іх нельга прагнаць, іх нельга падавіць, з імі **трэба ўжыцца**, іх можна (і належыць) перарабіць, **перавыхаваць толькі вельмі доўгай, павольнай, асьцярожнай арганізатарскай работай.** Яны акружаюць пралетарыят з усіх бакоў дробна-буржуазнай стыхіяй, **прасякаюць яго ёю, разбэшчваюць яго ёю, выклікаюць пастаянна ўнутры пралетарыяту рэцыдывы дробна-буржуазнай бесхарактарнасьці**, раздробленасьці, індывідуалізму, перахопаў ад захапленьняў да журбы. **Патрэбна самая строгая цэнтралізацыя і дысцыпліна ўнутры пралетычнай партыі пралетарыяту, каб гэтаму процістаяць, каб арганізатарскую ролю пралетарыяту (а гэта яго галоўная роля) праводзіць правільна, пасьпяхова, пераможна.** Дыктатура пралетарыяту ёсьць упартая барацьба, крывавая і бяскроўная, тваловая і мірная, ваенная і гаспадарчая, педагагічная і адміністратарская, супроць сіл і традыцый старога грамадзтва. Сіла прывычкі мільёнаў і дасятнаў мільёнаў—самая страшная сіла» (**Ленін**, збор твораў, т. XXV, стар. 190, выд. II).

Прывычка да дробна-буржуазнага застаецца і мы павінны яе перамагаць. Мы ведаем, што рабочая кляса ў асноўнай сваёй масе забясьпечыла перамогу пяцігодкі, што партыя здолела накіраваць яе волю, яе энэргію, яе ініцыятыву на справу сацыялізму, што яна, рабочая кляса, дала ленінцаў, разгарнула сацспаборніцтва і забясьпечыла гэтым посьпех пяцігодкі. Але мы ў той-жа час віколі хвасьцімам не займаліся, захапленьнем не недамагалі, мы ведаем, што пры адсутнасьці рэвалюцыйнай пільнасьці атрымліваецца часамі магчымасьць для клясавага ворага, пралезшага пад рабочую блузу, псаваць справу і на заводах, і на фабрыках, і ў калгаспах. Дробна-буржуазная бесхарактарнасьць праяўляецца і тут. Вось чаму патрэбна ўпартая і настойлівая работа. Сотні тысяч выдатных людзей, моладзі, прышоўшых да нас па завод, трэба выхаваць, не прыстасоўваючыся да іх, а падцягваючы іх да ўзроўню сьвядомага бальшавіка на справе. А для гэтага партыя сама павінна пястомна змагацца з усякімі ўхілісцкімі, дробнабуржуазнымі элементамі ў сваіх радох. Гэта забясьпечыць нам далейшыя перамогі.

***

Таварышы, наша партыя, як гаварыў тав. Сталін, непераможна, калі яна ведае, куды весьці справу і не баіцца труднасьцей, непераможна яму і таму, што на чале нашай партыі стаіць на зары яе зараджэньня такі вялізарнейшы геніяльны чалавек, як Ленін, і таму, што зараз на чале нашай партыі стаіць вялізарнейшы з паплечнікаў Леніна т. Сталін. **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя аплёдысмэнты).**

Таварышы, посьпехі, якіх мы з вамі дасягнулі, маюць буйнейшае міжнароднае і ўнутранае значэньне, яны ўзьнялі абароназдольнасьць нашай краіны, яны акрылялі пралетарыят усіх краін, пралетараў усяго сьвету. Даволі ўзяць водгукі сусьветнай прэсы аб пленуме ЦК і аб дакладзе тав. Сталіна на ім, каб убачыць, як сусьветная, нават буржуазная прэса, вымушана прызнаць нашы вялізарнейшыя перамогі. Яна, між іншым, расчаравана і дакладам тав. Сталіна і вынікамі пяцігодкі. Яна чакала, што вынікі пяцігодкі будуць значна больш для яе радасьнымі, г. зн. што вынікі пяцігодкі ўзмацняюць іх надзеі на крах пяцігодкі. А сёньня яны вымушаны прызнаць, што пяцігодка перамагла і стварыла магутную індустрыю. Нават самыя заядлыя нашы ворагі вымушаны прызнаць, што пяцігодка паставіла нашу краіну ў разрад перадавых індустрыяльных краін, што пяцігодка пераварыла СССР у крэпасьць, якую ня так лёгка будзе ўзяць сусьветнаму капіталу. Многія з іх «прарочылі» наконт нашай краіны, многія з іх лічаць яшчэ, што мы фантасты, ня гледзячы на тое, што мы завяршылі першую пяцігодку. Але іх лёс такі-ж, як і лёс «выдатнага» ангельскага пісьменьніка Уэльса. Памятаеце ў 1920 г. Уэльс прыяжджаў да нас. Ён напісаў тады аб гэтай паездцы кніту «Россия во мгле» і ў гэтай кнізе Уэльс пісаў:

«Ленін хоць і адмаўляе, як прававерны марксыст, усякія «утопіі», але, падыдзе, сам удаўся ў электрычную утопію. Ён усіні сіламі падтрымлівае плян арганізацыі ў Расіі гігантскіх электрычных станцый, якія павінны абслугоўваць цэлыя вобласьці сьвятлом, вадой і рухаючай сілай... Ці можна ўявіць больш адважны праект у вялізнай плоскай краіне, з бясконцымі лясамі і непісьменнымі мужыкамі, з вікчэмным разьвіцьцём тэхнікі і з наміраючымі прамысловасьцю і ганцлем. Такога роду электрыфікацыя існуе ўжо ў Галяндыі гаварыў, аб ёй і ў Англіі, і вельмі магчыма, што ў гэтых густа населеных і прамыслова разьвітых краінах яна скончыцца посьпехам і ажаваецца справай карыснай і эканомнай. Але ўявіць сабе яе прыстасаваньне ў Расіі можна толькі з дапамогай вельмі багатэй фантазіі. Я асабіста нічога падобнага ўзьняць сабе не магу; але гэты маленькі чалавек у Крамлі, відавочна, можа, ён бачыць, як прышоўшыя ў заняпад чыгункі будуць заменены электрычнымі, бачыць, як уся краіна пакрыецца сеткай такіх дарог і як разаўецца новая, камуністычная прамысловасьць. Ён гаварыў з такім запалам, што пакуль я яго слухаў, я амаль паверыў у магчымасьць гэтага»*)

Дык вось таварышы, гэта дробна буржуазны пісьменьнік, які пісаў утопіі і лічыў Леніна таксама ўтапістам, сёньня вымушан будзе канстатаваць, што калі ў нашай краіне ў 1913 годзе было выпрацавана 1.900 млн. кілёватгадзін, калі ў 1921 годзе гэта выпрацоўка ўпала да 0,5 млрд., г. зн. 500 млн. кілёват-гадзін, калі ў 1928 г. выпрацоўка ўзьнялася да 5 млрд., то ў 1932 г. мы выпрацавалі электраэнэргіі 13 з паловай млрд. кілёват-гадзін, г. зн. у 27 раз больш, чым было ў 1921 годзе. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

Вось яна, таварышы, фантастыка «маленькага» чалавека, сядзеўшага ў Крамлі, якога дробна-буржуазны, сапраўды маленькі чалавек не зразумеў і ня мог зразумець.

Таварышы. наближаецца 9-я гадавіна сьмерці Леніна. Гэта для нас сумная дата. Ленін адышоў ад нас, але сёньня ён, бальшавікі, можам сказаць, што і работа абяднанага пленуму ЦК і ЦКК і вынікі пяцігодкі паказваюць нам, як партыя з дня ў дзень, партыя Леніна крок за крокам разьбівае на сваім шляху ўсе перашкоды, ажыцьцяўляючы ідэі і наказы Леніна. Гэтыя чатыры гады былі гадамі кансалідацыі партыі і ўмацаваньня яе адзінства.

Фантастыкай і утопіяй лічылі буржуазныя ідэолёгі першую пяцігодку. Фантастыкай лічаць яны пабудову сацыялізму ў нашай краіне, а мы ўпэўнены ў сваёй перамозе, бо ёсьць у нас гераічная кляса пралетараў, мільённыя масы калгаснікаў, ёсьць магутная мільённая партыя, ленінскі Цэнтральны камітэт бальшавіцкай партыі і ёсьць той вялікі паплечнік Леніна, які сядзіць, як і Ленін, у Крамлі і кіруе вялізарнейшай барацьбой у гісторыі за вызваленьне чалавецтва ад уціску і эксплёатацыі. Яго ненавідзяць ворагі, затое яго любяць працоўныя і гэты чалавек — Сталін, пад кіраўніцтвам якога мы будуем і пабудуем сацыялізм. (**Доўгія незмаўкаючыя аплёдысмэнты, усе устаюць і наладжваюць авацыю**).

*) Г. Д. Уэльс «Россия во мгле» 1922 г. стар. 88-89.

# Ул. І. Ленін-- Клары Цэткін

**Ліст да Клары Цэткін, напісаны Леніным у адзін з самых вострых моментаў першага году існаваньня савецкай рэспублікі ва ўмовах блёкады і надзвычай абвостраных адносін з Германіяй. У сувязі з забойствам германскага пасла Мірбаха левымі эсэрамі, зносіны з заходня-эўрапейскімі сацыялістамі былі надзвычай затруднены. Ленін карыстаўся кожнай магчымасьцю адгукнуцца на рэвалюцыйныя зрухі, якія адбываліся ў міжнародным рабочым руху і ў той-жа час паведаміць іх аб разьвіцьці рэвалюцыі ў Расіі.**

**Ліст напісан на нямецкай мове.**

**Інстытут Маркса-Энгельса-Леніна пры ЦК УсеКП(б) 26-VII 1918 году.**

## Глыбокапаважаная тав. Цэткін!

**Вялікае гарачае дзякуй за ваш ліст ад 27-VI, які мне перадала тав. Герта Гардон. Я зраблю ўсё, каб дапамагчы тав. Гардон. Нас усіх надзвычай радуе, што вы, тав. Марынг і іншыя «таварышы спартакоўцы» ў Германіі галавой і сэрцам з намі. Гэта дае нам упэўненасьць, што лепшыя элементы заходня-эўрапейскай рабочай клясы, ня гледзячы на ўсе труднасьці, ўсё-ж прыдуць нам на дапамогу. Мы тут зараз перажываем магчыма самыя цяжкія тыдні за ўвесь час рэвалюцыі. Клясавая барацьба і грамадзянская вайна захапілі самыя шырокія масы насельніцтва ўсюды. У вёсках раскол. Беднота за нас, кулакі шалёна змагаюцца супроць нас. Антанта купіла Чэха-Славакаў. Бушуе контр-рэвалюцыйнае паўстаньне, аб'яднаная буржуазія прыкладае ўсе сілы, каб нас скінуць. Тым ня менш мы цьвёрда спадзяемся, што ўнікне гэтага «звычайнага» (як у 1791 і 1849 г. г.) ходу рэвалюцыі і перамогі буржуазіі.**

**З вялікай падзякаю, найлепшымі прывітаньнямі і шчырым паважаньнем. Ваш ЛЕНІН.**

**Р. С. Мая жонка просіць перадаць вам асабліва прывітаньне і таварышу Гошка. Яго прамову і ваш артыкул мы перавялі. І ўсім, ўсім прыяцелям найлепшае прывітаньне.**

**Р. С. Мне толькі што прынесьлі новую дзяржаўную пячатку. Вось адпячатак. Надпіс такі: Расійская Сацыялістычная Фэдэратыўная Савецкая Рэспубліка. Пралетары, ўсіх краін, злучайцеся!**

**Далей ідзе адбітак пячаткі. РСФСР.**

# УСПАМІНЫ тав. КРУПСКАЙ АБ ЛЕНІНЕ

20 студзеня ў таварыстве пэдагогаў-марксыстаў пры Камакадэміі адбыўся вечар, на якім з дакладамі, прысьвечанымі памяці Леніна выступілі **Кржыжаноўскі, Крамольнікаў, Мешчаракоў, Манцаў

# Аб няправільным якасным уліку загатоўленага ільнавалакна ў раённых канторах Загатільну і няправільным інфармаваньні ЦК Загатільном аб колькасьці загатоўленага ільну (у якасн. разрэзе)

## *Пастанова ЦК КП(б)Б*

1. Канстатаваць, што ня гледзячы на сваячасовы спуск раённым загатоўчым канторам указаньняў аб парадку ўліку загатаўляемага ільнавалакна як па колькасьці, так і па якасьці, аднак, канторы якасных патрабаваньняў па ільну (номернасьць па раёнах і па асобных калгасах і сельсаветах) не ўвязалі з мясцовымі савецкімі і партыйнымі органамі і Белзагатілём не патрабаваў ад сваіх раённых загатоўчых кантор прадстаўленьня праверэных даных у ходзе загатовак аб загатоўленым ільнавалакне — па якасьці і ў выніку злачынна-пядбайных адносін кіруючага складу Белзагатільну атрымліваемыя з месц няправільныя даныя аб загатоўленым ільне ўключаліся ў зводкі, дасылаемыя ЦК і цэнтру, без адпаведнай прадугледжанай інструкцыяй скідкі на якасьць (сырэц-стланец — 25 проц. скідкі, сырэц-мачанец — 50 проц).

Кіраўніцтва Белзагатільну таксама не прыняла сваячасовых мер і не інфармавала ЦК аб практыкуемай загатпунктамі прыёмцы сырцу № 2, які згодна інструкцыі аб прыёмцы прымацца не павінен.

РК і РВК са свайго боку як у ходзе падрыхтоўкі да загатоўкі ільну, так і ў працэсе самых загатовак не зьвярнулі ўвагі на якасныя сапатрабаваньні да паступаючага па загатоўках ільну.

У выніку такога простага «очковтирательства» з боку кіраўніцтва Белзагатільну і няпэбайных адносін да гэтага пытаньня па мясцох РВК і РК, Цэнтральны Камітэт быў пастаўлен перад фактам неабходнасьці вынішчэньня агульнага пляну ўжо загатоўленага ільну на 16-е студзеня з 80,9 проц. на 73,8 проц., г. зн. на 7,1 проц.

З прычыны гэтага ЦК пастанаўляе:

1 За «очковтирательство», простае ашуканьне Цэнтральнага камітэту партыі па пытаньні аб колькасьці і якасьці загатоўленага ільну — зьняць з работы кіраўніка Беларускай канторы Загатлён т. **Шэйніна** і справу ад ім перадаць у парткалегію ЦКК КП(б)Б.

Даручыць ЦКК устанавіць другіх вінаватых у гэтым асоб, непасрэдна адказных выканаўцаў, адказваючых за няправільную пастаноўку ўліку і праваючых якасьць прымаемага ільнавалакна з прыцягненьнем іх да суровай адказнасьці.

2. Зацьвердзіць кіраўніком Беларускай канторы Загатлён тав. Вайновіча, сакратара Лёзьнянскага РК КП(б)Б.

3. Адклікаць з загатовак намесьніка кіраўніка Белзагатілё тав. Пінхасіка.

4. Улічваючы, што ў выніку няправільнага ўліку загатоўленага ільнавалакна па якасьці па абсалютнай большасьці раёнаў пасьля пераразьлікаў атрымліваецца значнае зьніжэньне пляну загатовак (у сярэднім 7-10 проц.), прыняць, пасьля праверкі пераразьлікаў і ўтварэньня скідкі на якасьць, наступны разьмер ільназагатовак па асобных раёнах.

5. Прапанаваць Белканторы Загатлён, раённым канторам Загатільну, раённым камітэтам партыі і райвыканкомам у далейшых разьліках па выкананьні пляну асобнымі раёнамі і па Беларусі ў цэлым выходзіць з даных, устаноўленых праверкай і пераразьлікамі на 15-е студзеня 1933 г.

6. Пад асабістую адказнасьць т. т. Вайновіча і Пінхасіка забясьпечыць у далейшым сыстематычную праверку, правільнасьць уліку і дакладнасьць вестак аб колькасьці і якасьці загатоўленага ільну.

7. Абавязаць раённыя камітэты партыі, РВК, пад асабістую адказнасьць сакратароў РК і старшынь РВК, выходзячы з праверэных і ўдасканаленых даных аб выкананьні пляну загатовак ільну па раёнах па 15-е студзеня 1933 г. удасканаліць колькасьць здачы ільну кожным калгасам і аднаасобным гаспадаркай, робячы па гэтых калгасах і гаспадарках адпаведныя пераразьлік па якасьці прынятага ільну.

8. Абавязаць РВК, пад асабістую адказнасьць стоўпшынь, у адпаведнасьці з утворанымі пераразьлікамі па кожным калгасе і аднаасобнай гаспадарцы і ўтварэньні скідкай на якасьць прынятага ільну, дабіцца абавязковага стопроцантнага выкананьня пляну ільназагатовак як па колькасьці, так і па якасьці кожным калгасам і гаспадаркай на 1-е лютага 1933 г.

9. Прапанаваць раёнам, скончыўшым пляны ільназагатовак, разгарнуць шырокую работу па далейшай загатоўцы ільнавалакна, дабіваючыся абавязковага перавыкананьня пляну ільназагатовак, даручыць камітэту загатовак разам з Загатільном і раённымі ўстанавіць прыкладны працэнт перавыкананьня пляну ільназагатовак па асобных раёнах, маючы на ўвазе разгортваньне перавыкананьня пляну, галоўным чынам, па аднаасобным сэктары.

10. ЦК лічыць, што побач з Беларускай канторай Загатлён і раённымі канторамі, адказнасьць за няправільную інфармацыю Цэнтральнага камітэту аб ходзе выкананьня ільназагатовак па раёнах нясуць таксама раённыя камітэты партыі і раённыя выканаўчыя камітэты, асабліва ільняных раёнаў, якія не забясьпечылі штодзённага кантролю кіраўніцтва і нагляду за работай раённых загаткантор і не забясьпечылі прадстаўленьня гэтымі канторамі правільных, адпавядаючых сапраўднасьці вестак аб якасьці загатоўленага ільну.

ЦК абавязвае раённыя камітэты і РВК у далейшым устанавіць сыстематычны нагляд за работай раённых кантор і баз Загатільну, рашуча зьнішчэньні недахопы ў іх рабоце, выяўляючы вінаватых, прыцягваць іх да суровай адказнасьці.

# Пра назначэньне асобнаўпаўнаважаных ЦК КП(б)Б і СНК па арганізацыі і вывазцы торфу

## *Пастанова Савету Народных Камісараў і ЦК КП(б)Б*

Савет Народных Камісараў і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

Назначыць асобнаўпаўнаважаных СНК і ЦК КП(б)Б—старшынь наступных раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў па арганізацыі і вывазцы торфу: па Дуброўенскім РВК тав. Семашко, Церахаўскім —тав. Дупанава, Уваравіцкім—тав. Караленка, Сіроцінскім—тав. Ражкоўскага, Рэчыцкім—тав. Шляхтунова, Чашніцкім — тав. Пашко, Смалявіцкім—тав. Кузянцова, Асіпавіцкім—тав. Млодзка, Быхаўскім — тав. Грынкевіча, Магілеўскім—тав. Сапрыкага, Крычаўскім—тав. Захараву, Бабруйскім—тав. Аксючыца, Гомельскім — тав. Браўковіча, Аршанскім—тав. Валасевіча, Віцебскім—тав. Кардашэнка, Веткаўскім—тав. Сьліўкіна, Горацкім—тав. Кандраля, Гарадоцкім—тав. Яўдасева, Дрысенскім—тав. Орсіка, Дзяржынскім—тав. Вансоўскага, Жлобінскім—тав. Антонава, Крупскім—тав. Сільвэстрава, Клічаўскім—тав. Грыбедава, Чэрвеньскім—тав. Бушмана, Шклоўскім—тав. Мінчэнка, Барысаўскім—тав. Баранчыка, Сураскім—тав. Русака, Менскім —тав. Каранеўскага, Сеньненскім—тав. Себясевіча, Чавускім—тав. Адамчука, Пухавіцкім—тав. Ступакова, Рагачоўскім —тав. Мацко, Талачынскім—тав. Лагерава, усклаўшы на іх персональную адказнасьць за ход вывазкі торфу з торфзаводаў іх раёнаў і разгортваньне работы так, каб вывазка была скончана да 15 сакавіка г. г.

**Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.**
**Сакратар ЦК КП(б)Б І. ІВАНОЎ.**

20 студзеня 1933 г.
г. Менск.

# УСІМ САКРАТАРОМ РАЙКОМАЎ, СТАРШЫНЯМ РАЙВЫКАНКОМАЎ

Пастанова СНК і ЦК аб маслазагатоўках вамі ня выканана. Абавязацельствы аб здачы малака не даведзены, сетка малакапрыёмных пунктаў не арганізавана, загатовак малака няма, увага партыйных, савецкіх арганізацый і грамадзкасьці не мабілізавана. Такое становішча тлумачыцца бязьдзейнасьцю загатоўчага апарату, адсутнасьцю кіраўніцтва кэнтролю і дапамогі з боку райкому і райвыканкому. Прапануем: 23 студзеня скончыць давядзеньне абавязацельстваў аб здачы малакапрадуктаў, абавязаўшы загатоўшчыкаў пусьціць у эксплёатацыю ўсе заводы і пункты; 24 студзеня тэлеграфаваць зводку аб колькасьці даведзеных абавязацельстваў у сэктарыяльным разрэзе, у кожную пяцідзённку заслухоўваць загатоўшчыкаў аб ходзе загатовак, забясьпечыць подачу загатоўшчыкамі пяцідзённых тэлеграфных вестак пра ход загатовак. Аб прынятых мерах тэлеграфуйце.

**ЦК Рыскін.**
**СНК Галадзед.**

# ПАСТАНОВА

## ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР

**Аб тэрміне скліканьня IV сэсіі ЦВК БССР X скліканьня.**

**Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

**1. У зьмену ранейшых пастаноў склікаць IV сэсію ЦВК БССР 5 лютага 1933 г.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. ЧАРВЯКОЎ.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. ГНІЛЯКЕВІЧ.**

*Урачыстае пасяджэньне, прысьвечанае*

**10-годзьдзю Дзяржаўнай Бібліятэкі,**

*прызначанае на 23-га студзеня*

**ПЕРАНОСІЦЦА**

*Аб дні правядзеньня будзе абвешчана дадаткова.*

# Чорная дошка

**Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:**

## ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ І ІЛЬНУ:

**ТАЛАЧЫНСКІ** (сакратар РК тав. **Славін**, старшыня РВК тав. **Лагераў**, упаўнаважаны ЦК Тав. **Тамашэўскі**).

**ДУБРОВЕНСКІ** (сакратар РК т. **Кацман**, старшыня РВК тав. **Семашко**, упаўнаважаны ЦК тав. **Шаліма**).

## ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

**СЕНЬНЕНСКІ** (сакратар РК тав. **Дашукевіч**, старшыня РВК тав. **Себісевіч**, упаўнаважаны ЦК тав. **Берзін**).

**СІРОЦІНСКІ** (сакратар РК тав. **Усенка**, старшыня РВК тав. **Ражноўскі**, упаўнаважаны ЦК тав. **Вільчак**).

## ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ:

**ПРАПОЙСКІ**

**ЖЛОБІНСКІ** (старшыня РВК т. **Антонаў**, упаўнаважаны ЦК т. **Баскін**).

## За зрыў загатовак усіх відаў занесены на чорную дошку наступныя сельсаветы:

па **Дзяржынскім:** вёска Шатаноўшчына; па **Пятрыкоўскім раёне:** Ніцкі; па **Клімавіцкім раёне:** Красавіцкі сельсавет; па **Лепельскім раёне:** вёскі Круглянцы і Сталбцы; па **Бягомльскім раёне:** Дамбражыцкі сельсавет; па **Лагойскім раёне:** Гайнінскі; па **Чашніцкім раёне:** Стражавіцкі; па **Клічаўскім:** Віркаўскі, Грыбавецкі, Дубеньскі; па **Сураскім;** Камароўскі; па **Аршанскім:** Буеўтскі; па **Пухавіцкім:** Гарэліцкі, Слабодкі, Задашчанскі і Шацкі; па **Вушацкім** раёне: Усайскі сельсавет; па **Крычаўскім:** Цяпінскі сельсавет; па **Рэчыцкім раёне:** Артукаўскі, Холміцкі, Караваціцкі сельсаветы; па **Мсьціслаўскім раёне:** Татарщанскі і Доўгавіцкі сельсаветы.

***

Суровую вымову за самавольны выезд з раёну атрымаў тав. Левін, намесьнік Наркамгасу, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па загатоўках у Мазырскім раёне.

# З ПАКЛІ—ЛЁН

РАСОНЫ. (Наш спэцкар.).

Кулацкі саботаж ільназагатовак ідзе па дзьвёх лініях.

— Сарваць колькаснае выкананьне пляну.

—Зьнізіць якасьць ільнапрадукцыі, якая здаецца дзяржаве.

І тая і другая «лініі» вядуць да адной мэты: сарваць забясьпячэньне сацыялістычнай прамысловасьці сырцом.

Кулаку не ўдалося затрымаць ільнапрадукцыі. У жорсткай клясавай барацьбе лён спаганяецца са злосных нядзатчыкаў, лён ідзе на прыёмачныя пункты. Але кулаку ўдалося дабіцца таго, што часта замест трапанага ільну здаецца сырэц, пакля.

Толькі па адным Расонскім раёне за час загатовак здано дзяржаве 60 тон паклі, не гаворачы аб ільнавалакне—сырцу.

У разе выпадкаў паклю здаюць калгасы, дзе пад уплывам кулацкай агітацыі пануюць рвацкія настроі.

Тыя, хто падпаў пад кулацкі ўплыў, горка памыліліся: пакля ў плян не залічваецца, хоць і прымаецца на загатоўчых пунктах. Стаўка на тое, каб здаць што папала, абы толькі выканаць плян—бята.

Намесьнік старшыні СНК тав. **Бэнэк,** каб даць тым калгасам і працоўным аднаасобнікам, якія здавалі дрэнную прадукцыю, магчымасьць выйсьці са становішча, загадаў загатоўчым арганізацыям:

— Дазволіць тым калгасам і працоўным аднаасобнікам, якія здавалі паклю, па прадяўленьні квітанцыі, узяць яе назад і тутжа на загатоўчым пункце перапрацаць і зноў здаць дзяржаве.

Адным словам, гэта распарадканьне значыла: зрабіць з уцілю прадукцыю, годную для сацыялістычнай прамысловасьці.

Многія таварышы, у тым ліку і кіруючыя, вельмі скептычна аднесліся да гэтай справы. Сакратар Расонскага РК тав. **Карчык** хвалявуўся: «Гэта нам сарве ільназагатоўкі.

Так спалохаліся людзі новага мерапрыемства. Спалохаліся зусім дарэмна. У калгасах і вёсках была праведзена растлумачальная работа, каб на пунктах перапрацаваць паклю, ператварыць яе ў валакно. Калгасы і працоўныя аднаасобнікі жыва адгукнуліся на гэта мерапрыемства. Дзіўныя справы творацца зараз. Праяжджаючы праз мястэчка Клясьціцы, вы ўбачыце сотні людзей каля ільнабазы. На дваро, на вуліцы кіпіць работа: пакля ператвараецца ў валакно. Растуць процанты выкананьня пляну, зьмяншаецца запазычанасьць дзяржаве. Тое-ж робіцца і ў Расонах — на цэнтральнай базе. Сотні людзей возяцца з паклямі, выкалачваюць кастру, растуць валакна. Калгас «Ударнік» 17 студзеня прыслаў брыгаду з 30 чалавек. За дзень выпрацавалі 3 цэнтн. валакна. Значная частка яго ідзе пад № 6. Выхад валакна з паклі на менш 30 процантаў. На Чырвонапольскім пункце за два дні дапрацавана звыш трох тон.

Так з груды паклі вылучваецца сапраўднае каштоўнае валакно — залатая валюта СССР.

**А. М.**

# ЗЬБІРАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ ПОПЕЛ!

## Пастанова Менгарсавету

Дрыўляны попел зьяўляецца каштоўным угнаеньнем для павялічэньня ўраджайнасьці бульбы, гародніны і збожжавых культур.

Выходзячы з гэтага **прэзыдыум Менгарсавету пастанавіў абавязаць усе дзяржаўныя установы, прадпрыемствы, вайсковыя часьці, жакты, каапэрацыйныя, грамадзкія арганізацыі і ўсіх прыватных дамаўласьнікаў зьбіраць і захаваць увесь дрыўляны попел.**

Попел трэба зьбіраць і захоўваць у сухім выглядзе бяз усякіх адкідаў, пеўн. зг. ўсё ў скрынках, або ў бачонках, абітых з сярэдзіны бляхай. Сабраны попел рэгулярна і дарэмна здаваць саўгасам і калгасам раёну, прымацаваным да тых ці іншых прадпрыемстваў або ўстаноў.

Адказнасьць за збор і захоўваньне попелу ўскладаецца: ва ўстановах — на камэндантаў дамоў, на прадпрыемствах — на дырэктароў, у жактах — на старшынь жактаў, ва ўсіх каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацыях — на кіраўнікоў арганізацый, у вайсковых часьцях — на начальнікаў гаспадарчых часьцей, у прыватных дамох— на дамаўласьнікаў.

Адказнасьць за вывазку попелу ўскладаецца на дырэктароў саўгасаў і старшынь калгасаў.

# ВАЕННЫЯ АПЭРАЦЫІ НА ГРАНІЦЫ ЖЭХЭ

БЭЙПІН, 20. Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе з Цзіньчжоу, што 19-га студзеня на граніцы правінцыі Мукдэнскай і Жэхэ **пачаліся ваенныя апэрацыі,** якія зьяўляюцца падрыхтоўчымі да далейшых апэрацый у правінцыі Жэхэ. Кавалерыйская брыгада, якая прымала ўдзел у апэрацыях у Шан хайгуані і якая заняла потым пункты Цзюменькоу і Юнаньбао 19-га прыбыла ў Цзіньсі, на граніцы Жэхэ і аб'ядналася з кавалерыйскім палком, які прыбыў з Цзіньжоу і пяхотнымі часьцямі, што прыбылі з Ляндзяня.

Кавалерыйскія і пяхотныя часьці суправаджаюцца авіяцыяй. У часе наступленьня адбываліся невялікія сутычкі з паўстанцамі.

У японскім вайсковым міністэрстве заяўляюць, што канцэнтрацыя японскіх часьцей у Цзінсі зьяўляецца «нармальнымі ваеннымі крокамі» і сьцьвярджаюць, што асноўныя ваенныя дзеяньні па «ачыстцы Жэхэ» пачнуцца праз некаторы час. Пры гэтым у вайсковым міністэрстве пацьвярджаюць, што «пытаньне аб Жэхэ павінна быць вырашана ў кожным выпадку да лета».

У асьвядомленых колах мяркуюць, што ваенныя дзеяньні ў Жэхэ пачнуцца да наступленьня цяпла, што дасьць магчымасьць японцам скарыстаць сучасную зброю бою—танкі і цяжкія гарматы, перасоўваньне якіх вясною затрудняецца.

## ЯПОНЦЫ ЗАХВАЦІЛІ ЦЗІНЬСІ

ШАНХАЙ, 21. Згодна японскага паведамленьня, японскія часьці ў складзе кавалерыйскай брыгады (пад камандай Моті) і кавалерыйскага атраду (пад камандай Міяка) у суправаджэньні аўтамабільных і аэраплянных часьцей заняілі Цзіньсі (на граніцы Жэхэ) і разьбілі невялікія валёнтэрскія атрады.

# Японскія камэнтары да паведамленьня ТАСС

ТОКІЕ, 19. Газэта «Ніцы Ніцы» ў перадавым артыкуле, камэнтуючы перапіску аб япона-савецкім пакце, выказваецца за заключэньне пакту. Газэта асуджае японскі ўрад за затрыманьне адказу на савецкую прапанову, зробленую год назад, і лічыць, што довады супроць заключэньня пакту, паданыя ў японскім адказе, ня вытрымліваюць крытыкі. Разам з тым газэта знаходзіць магчымым згадзіцца з думкаю міністра замежных спраў аб неабходнасьці «зьнішчэньня прычын, якія ёсьць або спрэчак, якія могуць узьнікнуць паміж краінамі».

Для гэтага газэта прапануе заключыць «асобны пакт адначасова з пактам аб ненападзе, або папярэдняе заключэньня пакту аб ненападзе». Газэта адзначае, што ў японскіх афіцыяльных колах абвінавачваюць СССР у парушэньні абяцаньня не апублікоўваць перапіскі бяз ведама японскага ўраду, прычым газэта тут-жа зазначае, што «гэта зьяўляецца фармальным момантам і няма асобнай патрэбы папракаць савецкі ўрад за апублікаваньне перапіскі, а замест папрокаў трэба займацца дзелавым абмеркаваньнем праблемы па сутнасьці».

Газэта выказвае зьдзіўленьне адносна таго, што японскі ўрад затрымаў адказ «на такую важную прапанову на год». «Відавочна, — піша газэта, — гэты зьдзіўляючы факт паказвае, што японскі ўрад не намеран заключаць пакту, або, што думкі адпаведных інстанцый разыходзяцца па гэтым пытаньні. У кожным выпадку такое значнае затрыманьне дае магчымасьць адгадаць пазыцыю японскага ўраду».

«Азнаямленьне з довадамі міністэрства замежных спраў супроць пакту, — піша далей газэта, — ня можа нікога прыцягнуці у лягер працўнікаў заключэньня пакту. Міністэрства замежных спраў дае тлумачэньне, што ні Японія, ні СССР у дадны момант не намераны парушаць тэрыторыі адзін другога, таму ня трэба заключаць і пакту. Падобны погляд, наадварот, можа быць скарыстаны ў якасьці аргуманту на карысьць заключэньня пакту і ў кожным выпадку ня можа служыць прычынай для адхіленьня савецкай прапановы».

**Заўвага:** Як ТАСС'ам устаноўлена, ніякага абяцаньня аб неапублікаваньні зьместу абмену нотамі або нават тэкстуальна саміх нот савецкі ўрад не даваў і ў гэтых адносінах ніякімі абавязацельствамі ён ня быў зьвязан. Пытаньне аб пакце ўзьнікла па ініцыятыве савецкага ўраду, які зусім ня меў намеру ўтойваць ад грамадзкай думкі Саюзу перагаворы наконт прапановы, якая зроблена ім публічна і якая абгаворвалася ў прасе ўсяго сьвету, у тым ліку і японскай, на працягу амаль году.

# ЧУТКІ АБ ПЕРАМЯШЧЭНЬНЯХ НА ПОЛЬСКІХ ДЫПЛЁМАТЫЧНЫХ ПАСТОХ ЗАГРАНІЦАЙ

ВАРШАВА, 15. У польскіх палітычных колах цыркулююць чуткі аб маючых адбыцца перамяшчэньнях на польскіх дыплёматычных пастох за граніцай. Гэтыя перамяшчэньні ставяцца ў сувязь з нядаўным спатканьнем міністра замежных спраў Бэка з маршалам Пілсудзкім у Вільні і закрануць польскіх прадстаўнікоў у Рыме, Вене, Парыжы, Лёндане і Атэнах. У якасьці кандыдата на пост польскага пасла ў Нарыжу называюць сэнатара Патоцкага.

# Скарыстаньне сонечнай энэргіі

ТАШКЕНТ. Геофізычная абсэрваторыя ў Ташкенце правяла пасьпяховыя вопыты **па акумуляваньні сонечнай энэргіі.** Сонечны акумулятар плошчаю ў 0,71 кв. мэтраў у летні дзень падымае тэмпэратуру 60 літраў вады ад 18 да 100 градусаў. Гэта дае сярэднюю гадавую прадукцыйнасьць у 16 тысяч літраў вады на мэтр акумулятару. Абсэрваторыя знайшла спосабы ізаляцыі сонечнага жатла. Яе акумулятар, ёмкасьцю ў 150 кубамэтраў вады, нагрэтай да 100 градусаў, астывае да тэмпэратуры паветра толькі на працягу году.

Пачалося ўжо практычнае скарыстаньне сонечнай энэргіі. **Ташкенцкая абсэрваторыя мае кухню, лазьню і вадакачку, якія працуюць выключна на сонечнай энэргіі.** Зараз уводзяцца поўнае бытавое абслугоўваньне работнікаў абсэрваторыі сонечнай энэргіяй.

**У Самаркандзе** пачаты вопыты па ператварэньні сонечнай энэргіі ў электрычную.

# ПАПРАЎКІ

У дакладзе тав. Сталіна на пленуме ЦК і ЦКК, апублікаваным у «Зьвязьдзе» ад 10 студзеня, з-за нявыразнай перадачы з Масквы ўкраліся памылкі:

У трэцім разьдзеле, у другой калёнцы, у шостым радку чацьвертага абзацу трэба чытаць: «... Германіі—да 35 проц.». У тым-жа разьдзеле, у чацьвертай калёнцы, 29 радку трэцяга абзацу трэба чытаць: «...Валавая прадукцыя прамысловасьці складала тады 30.800 млн. руб.». У пятым разьдзеле ў другой калёнцы, у 11 радку дванаццатага абзацу трэба чытаць: «...Больш 35 млрд. даляраў». У шостым разьдзеле, у другой калёнцы, у другім радку чацьвертага абзацу трэба чытаць: «якая паднялася да 187 проц.».

***

У пастанове Менгаркому, зьмешчанай у «Зьвязьдзе» ад 21 студзеня, украліся памылкі. У трэцім абзацы надрукавана «Культпропу ЦК забясьпечыць», а ў дванаццатым абзацы надрукавана «... даручыўшы агітмасаваму аддзелу ЦК». Павінна быць: «Культпропу ГК забясьпечыць», «... даручыўшы агітмасаваму аддзелу ГК».

**Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.**

**Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)**
СЕНЬНЯ **Кузьма Чорны**
**БАЦЬКАУШЧЫНА**
Эпопея ў 4-х дзеях
Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў рэп. касе і касе тэатру

**Пастаяннае дзяржаўнага польскага тэатру** імя 11 ліпеня (Савецкая, 29, тэл. 15-20, 2161)
**ЭСТРАДНЫ ТЭАТР „ДАМЭЦ"**
**СЕНЬНЯ**—2-гі цыкль. НОВАЯ ПРАГРАМА. Канферансье **К. З. Гібшман.**
Пачатак роўна ў 8 з палов. гадз. вечара. Білеты ў рабінсе з 12 да 2 і з 4 да 5 гадз. веч. і ў касе тэатру з 10 12 і з 5 да 10 гадз. вечара.

| | |
|---|---|
| Чырвон. Зорка Каса—ад 1 г. дня | Гукавы мастацкі фільм ПЕРАМОЖЦЫ НОЧЫ Кіно-рэвю ў 8 частках |
| Інтэрнацыянал Каса—ад 12 г. дня | Новы мастацкі фільм ЧАЛАВЕК з ОРДЭНАМ |
| Кіно ПРАЛЕТАРЫ | ТРАНСПАРТ АГНЮ Звыш прагр. кіно-хроніка |
| СПАРТАК Каса ад 1 г. дня. | Мастацкі фільм ВОРАГ ЛЯ ПАРОГУ драма ў 5 частках. |

Народны Камісарыят Працы і галоўсацстрах БССР
**ПЕРАМЯСЬЦІЛІСЯ**
з Чырвонаармейскай
**у Дом Ураду**
(левае крыло, 5 і 6 паверх).



ЗВАРОТ КЭЙТАНА БЭКЕРА

У сувязі з тым, што рад арганізацый ашчэ дагэтуль непрадставілі нз зацьвярджэньне
**адпускныя цэны на мясцовыя „БУДМАТАР'ЯЛЫ"**
У адпаведнасьці з пастановай СНК БССР ад 14-7-32 г. за № 319, чым лазбаўляюць магчымасьці ацаліць іх, што выклікае спыненьне аплаты рахункаў банкамі,
**апавяшчаецца, што** **ўсе арганізацыі і ўстановы,**
якія выпускаюць **МЯСЦОВЫЯ БУДМАТАР'Я**
**(фібраліт, бутавы камень, гравій, пясок і інш.)**
**ПАВІННЫ** праз свой рэспубліканскі цэнтр (кір. мясцовай прамысловасьці, Наркамгас, Белжылсаюз і інш.)
**прадставіць не пазьней 25 студзеня 1933 г.**
у бюро цэнтральн. кір. упаўн. НКЦП СССР пры СНК БССР
**ПРАЕКТ адпускных цэн на 1933 год.**
Да праекту павінны быць даданы падрабязныя разьлікі з пацьвярджэньні і абгрунтаваньні адпускной цаны, у прыватнасьці: 1) справядзлівыя калькуляцыі камэрцыйнага сабекошту 1932 г., 2) зацьвярджэньне прадпрыемствам зьніжэньня камэрцыйнага сабекошту на 1933 г.; 3) якія адпускныя цэны і іскавелі да гэтага; 4) тэхнічаальную запіску.
**Пасяджаньне намісіі бюро цэн адбудзецца** у пазьнаньні кіраўніцтва ўпаўн Наркамгаспраму (Дом Ураду, 5-ы паверх)—**1 лютага ў 12 гадзін дня,** на якое павінны зьявіцца прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый.
Даведкі атрымліваць ў кір. упаўн. НКЦП т. Гольдбэрга.
**Бюро цэн кір. упаўн. НКЦП СССР пры СНК БССР.**

**КУРСЫ** ўмоваў і стэнаграфіі
ПРАЦЯГВУ НАСТАЎНІЦТВА
АДКРЫВАЮЦЦА НОВАЯ ГРУПА
Ці вагі, мова і стэнаграфія
Бер. Сьвіслоцкі, 3., 24 шко.
Канцылярыя адкрыта з 7—8 гадз. веч.

Ячэйка КП(б)Б і МК і правяўніі беларускіх кантор „Саюзгазгакон" і „Саюзкожнабзбыт" з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці адданага і актыўнага грамадзкага працаўніка
**тав. ХАРЛЕНКА А. Ф.**
і выражаюць сваё спачуваньне сям'і нябожчыка.
**Вынас цела адбудзецца 23 студзеня ў 3 г. 33 хв. дня з плюбу памэрлага**

Адміністрацыя бел. кантор „Саюзкож" і „Саюзкожнабзбыт" з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці актыўнага работніка кр. члена КП(б)Б
**тав. ХАРЛЕНКА А. Ф.**
і выражаюць спачуваньне сям'і нябожчыка.
**Вынас цела адбудзецца 23 студзеня ў 5 г. 33 хв. дня з плюбу памэрлага** (вугал Рэвалюцыйнай і Камсамольскай вуліц)

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

Менск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбел № 337.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2